Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЖНІВЕНЬ 24 1932 г. № 189 (4441).

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—За якасьць зяблева і асеньняй сяўбы.
В. ТАРСКІ—«Будучыня робіцца імглістай і няпэўнай» (2 стар.).
Л. ЧАРНЯКОЎ—Дзесяць месяцаў напружанай барацьбы (3 стар.).
Зьм. ПАВАРОТНЫ—Пярэбары акраіны (3 стар.).
ПРА ПЕРАБУДОВУ РАБОТЫ І АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ФОРМЫ ПРАМКААПЭРАЦЫІ —пастанова Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б (1 стар.).
ПРА СПРАВУ РЭЧЫЦКІХ РАБОТНІКАЎ — пастанова Парткалегіі ЦККП(б)Б (2 стар.).
Да 30 верасьня не пакінуць на полі ніводнага снапа збожжавых (1 стар.).
Уключайцеся ва ўсебеларускую пазыкавую эстафэту (2 стар.).
Барацьба за апал—важнейшая задача партарганізацый (3 стар.).
ЗА МЯЖОЙ:
Напярэдадні антываеннага кангрэсу (4 стар.).
Японскія войскі занялі Нанлін (4 стар.).

За якасьць зяблева і асеньняй сяўбы

СНК БССР і ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб зяблевым ворыве папярэдзілі, што **ацэнкай здольнасьці** партыйных і савецкіх арганізацый змагацца за павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў побач з уборачнай кампаніяй і асеньняй сяўбой будзе зьяўляцца тое, наколькі яны справяцца **з выкананьнем** пляну зяблева.

Асноўная задача ў часе сяўбы і зяблева, якая стаіць перад кожным саўгасам, калгасам і МТС—гэта барацьба за высокі ўраджай. Якасьць, якасьць і яшчэ раз якасьць—вось баявы лёзунг сёнешняга дня. «Пагоня за колькасьцю гэктараў, ня лічачыся з тэрмінамі і якасьцю работы, у радзе раёнаў нанесла шкоду ўсёй с.-г. вытворчасьці, вядучы да павялічэньня засьмечанасьці палёў, зьнижэньня ўраджайнасьці, паніжэньня якасьці збожжа і г. д.» (з пастановы НКЗ СССР).

Выконваючы пляны асеньняй сяўбы і зяблева, раённыя партыйныя арганізацыі павінны так расставіць сілы, каб калгасныя масы **сапраўды былі мабілізаваны на барацьбу за добраякасны пасеў, добраякаснае ўзорваньне глебы, выкананьне ўсіх работ у вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін.**

У гэтым годзе па БССР трэба засеяць 1.360.000 гэктараў, зазяблiць 1.500.000 гэкт. Выканаўшы даныя пляны, мы гэтым самым яшчэ раз нанясем зьнішчальны ўдар па клясаваму ворагу—кулаку, створым магутную глебу для далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Вопыт мінулых гадоў паказаў, што асеньняе ворыва дае павялічэньне ўраджайнасьці ільну звыш 20 проц. супроць веснавога ворыва, па бульбе—звыш 15 проц. Лічбы гавораць самі за сябе: калі яравыя будзем сеяць па глебе ўзаранай на зіму, мы **павялічым ураджайнасьць нашых палёў у сярэднім на 20 проц.** Ня трэба забываць таксама, што зяблева і лушчэньне глебы—адно з асноўных мерапрыемстваў па барацьбе з пустазельлем і са шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб зяблевай кампаніі зьвярнулі сур'ёзную ўвагу на асеньняе ворыва ў гаспадарках таварна-прамысловага гароднiцтва. Яны абавязалі НКЗБ, райвыканкомы і райкомы партыі забараніць пасеў гароднiны на незазябленай зямлі. Гэта ўказаньне партыі і ўраду павінна быць выканана безагаворачна.

Таксама неабходна адзначыць, што **позьняе ворыва ў галіне павышэньня ўраджайнасьці і барацьбы** са шкоднікамі і пустазельлем значна зьніжае дадатковы выхад прадукцыі.

Вось чаму партыя і ўрад у пастанове аб зяблевай кампаніі вызначылі тэрмін скончэньня ворыва на зіму да наступленьня асеньніх халадоў—да 20 кастрычніка. А таму на скончэньне пляжаў зяблева да вызначанага ўрадам тэрміну павінна быць зьвернута ўся ўвага партыйных і савецкіх арганізацый раёнаў і сельсаветаў.

Толькі пры ўмове правільнай арганізацыі працы, люўнага скарыстаньня конскай і трактарнай цягі, шырока разгорнутай масава-палітычнай работы вакол гэтай важнейшай кампаніі, разгортваньня сацыяборніцтва і ўдарніцтва, сацыялістычнай узаемадапамогі паміж калгасамі і саўгасамі, пры канкрэтным апэрацыйным кіраўніцтве—магчыма будзе выкананьне пляну. Самацёку павінна быць абвешчана самая рашучая барацьба. У пастанове ПК КП(б)Б і СНК БССР сказана: «Абавязаць пэрсанальна сакратароў райкомаў і старшынь райвыканкомаў мерапрыемствы па лушчэньні глебы і зяблеве паставіць як адну з важнейшых гаспадарча-палітычных задач у сельскай гаспадарцы, устанавіць самы строгі кантроль за гэтай справай, забясьпечыць канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва кампаніяй».

Задача ўсіх раённых партыйных арганізацый—шляхам растлумачальнай работы мабілізаваць масы рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—адзінасьнікаў на выкананьне пляну зяблева. Вясковыя партыйныя і камсамольскія ячэйкі павінны быць у першых радох змагароў за павышэньне ўраджайнасьці. Раённы друк, саўгасныя і калгасныя насьценгазэты і рабселькоры павінны і тут адыграць сваю арганізуючую ролю, якую адыгрывалі яны ў правядзеньні іншых сельска-гаспадарчых палітычных кампаній.

Калгасная вытворчая пастаянная брыгада павінна быць асноўным вагаром у правядзеньні асеньніх работ. Ужо цяпер, не адкладваючы; трэба давесьці і замацаваць за брыгадамі вучасткі на ўвесь будучы год і паказаць, дзе яны па вінны сеяць азімыя, дзе яравыя з тым, каб брыгады ўжо цяпер разгарнулі барацьбу за высокі ўраджай у 1933 годзе.

Разам з тым брыгады павінны разгарнуць ударную работу па скончэньні ўборкі позьніх яравых і вызваляць свае вучасткі для разгортваньня зяблева. Вядома, гэта магчыма толькі пры ўмове, калі кожная брыгада будзе ведаць свой вытворчы вучастак і будзе ўпэўнена, што на гэтым вучастку яна будзе праводзіць усе працэсы сельска-гаспадарчых работ пакуль не ўбярэ ўраджай.

Неабходна адзначыць, што ва многіх калгасах сапраўдных вытворчых брыгад няма. Ва многіх мясцох яны арганізаваны няправільна. Таму ўсе партыйныя арганізацыі і зямельна-калгасныя органы павінны дапамагчы калгасам у часе асеньніх работ арганізаваць сапраўдныя вытворчыя пастаянныя брыгады ў калгасе, выправіўшы дапушчаныя скажэньні пры іх арганізацыі. **Умацаваньне вытворчых брыгад зьяўляецца зараз адзнай з баявых задач.**

Асноўнымі тормазамі зяблевай кампаніі ў мінулым годзе былі: недаацэнка конскай цягавай сілы, няюўнае і нерацыянальнае скарыстаньне трактарнай цягі. У некаторых раёнах увесь трактарны парк на працягу цэлых пяцідневак у часе разгару сяўбы азімых і зяблева прастойваў з-за адсутнасьці змазачна га і гаручага і з-за дрэннага рамонту трактараў. У выніку плян зяблева па БССР быў выканан толькі на 47,2 проц. Гэта бязмоўна ў значнай ступені адбілася на павышэньні ўраджайнасьці ў гэтым годзе. А таму ўрокі мінулага году павінны быць улічаны.

Жнівень месяц ва ўмовах БССР — месяц скончэньня ўборкі яравых збожжавых. Спрыяючыя кліматычныя ўмовы даюць магчымасьць скончыць уборку яравых збожжавых у тэрмін. Ужо цяпер трэба частку вольнай цягавай сілы пераключыць на наступныя с.-г. работы—асеньнюю сяўбу, і зяблева. У часе правядзеньня асеньніх работ уся цягавая сіла павінна быць пераключана на сяўбу азімых і зяблева.

Трэба раз назаўсёды пакончыць з гутаркамі аб тым, што зяблева пачакае. Такім раз важаньням павінен быць дан рашучы бальшавіцкі адпор. Зараз-жа пасьля ўборкі збожжавых неабходна распачаць ворыва на зіму.

Вядома, трэба арганізаваць работу так, каб зяблева і лушчэньне глебы не перашкаджалі сяўбе азімых і правядзеньню с.-г. кампаніі.

Пры правядзеньні асеньніх работ, сяўбы азімых і зяблева, якасьць ворыва павінна быць пастаўлена як адна з важнейшых задач. Якасьць сельгасработ абумоўліваецца ў першую чаргу строгім захаваньнем тэрмінаў, намечаных агратэхнікай. Тое, што ў цэлым радзе раёнаў пустазельле заглушыла яравыя пасевы гэтага году гаворыць аб ігнараваньні агратэхнікі і ў першую чаргу тэхпляжаў.

Можна прывесьці шмат прыкладаў, дзе перадавыя калгасы разам з уборкай праводзяць лушчэньне глебы. Прыклады перадавікоў па аснове масавай работы павінны быць падхоплены ўсімі калгасамі і саўгасамі.

У часе правядзеньня кампаніі трэба рашуча змагацца з недаацэнкай аднаасобнага сэктару. Бедняк і серадняк — аднаасобнікі не павінны адставаць ад калгасаў і саўгасаў.

СНК і ЦК КП(б)Б папярэдзілі, што здольнасьцю партыйных і савецкіх арганізацый змагацца за павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў, побач з уборачнай кампаніяй; асеньняй сяўбой, будзе зьяўляцца і тое, наколькі яны справяцца з выкананьнем пляну зяблева.

Гэта азначае, што партыйныя і савецкія арганізацыі павінны мабілізаваць масы, разгарнуць сярод іх масавую работу і да 20 кастрычніка не пакінуць ніводнага гэктара не ўзаранага на зіму. Плян зяблева павінен быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін.

Новы ўрад у Румыніі

ВЕНА. З адкрытцём нававыбранага румынскага парламанту ўрад Ванды-Ваяводы падаў у адстаўку. Новы ўрадавы крызіс быў даволі працяжны. «Парляманцкія колы» ўсё ніяк не маглі сфармаваць «парляманцкага» ўраду. Пытаньне аб калітыйным ўрадзе з прадстаўнікоў некалькіх партый адразу адпала, але кіруючая партыя нацыянал-цараністаў, якая, дзякуючы, «выбарчай прэміі», мае большасьць у парламанце, ніяк не магла дабіцца сярод сваіх радоў аднадушнасьці адносна таго, каму ўзначальваць урад.

Стары «сатульна-прызнаны» правадыр партыі Маніу, які ў апошнія гады стаіць фармальна ў баку ад кіраўніцтва партыяй, згадзіўся зноў афіцыяльна стаць на чале партыі, але ўзначальваць урад адмовіўся, як відаць, не жадаючы кампрамэтаваць сябе разам з урадам. Па таіх-жа прычынах ухіліўся ад паста прэм'ер-міністра Міхалаке, які быў старшынёй партыі ў адсутнасьць Маніу (Міхалаке — лідэр «царанісцкага» крыла). Усё-ж Міхалаке ўвайшоў у склад ураду ў якасьці міністра ўнутраных спраў. Прэм'ер-міністрам застаўся Вайда-Ваявода, які ўзяў на сябе таксама і міністэрства замежных спраў.

Вельмі многа разважаньняў пры фармаваньні ўраду было аб тым, хто займе пост ваеннага міністра. З самага пачатку было ўстаноўлена, што аб выбары ваеннага міністра кіраўнікі нацыянал-царанісцкай партыі клапаціцца ня будуць, а абмяжуюцца «рэкамэндацыяй», г. зн. **назначыць ваеннага міністра сам кароль.** Аднак, у адзін час было меркаваньне, што на гэты пост будзе назначан «штацкі» палітычны дзеяч Юніян. Але ў апошні момант, па простым указаньні караля Кароля, які кіруецца ў важных выпадках «парадамі» з Парыжу, **ваенным міністрам быў назначан генэрал Самсановіч, былы начальнік румынскага генэральнага штабу.**

Пра перабудову работы і арганізацыйныя формы прамкаапэрацыі

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

Для далейшага разгортваньня вытворчай ініцыятывы прамысловай арцелі, а таксама для максымальнага пашырэньня прамысловай каапэрацыяй вырабу прадметаў шырокага спажываньня і для забесьпячэньня няўхільнага і поўнага ажыцьцяўленьня пастановы ЦВК і СНК СССР аб перабудове работы і арганізацыйных форм прамысловай каапэрацыі (З.З. СССР, 1932 г., № 57, арт. 340) СНК БССР і ЦК КП(б)Б прапануюць правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. У галіне загатоўкі сырцу і матар'ялаў вытворчасьці

а) Прапанаваць усім мясцовым партыйным і савецкім органам аказаць прамысловай каапэрацыі ўсямернае садзейнічаньне ў скарыстаньні даных пастановай ЦВК і СНК СССР ёй праў па загатоўцы сырцу і пры цягваць да адказнасьці ўсіх тых, хто перашкаджае ёй у гэтай справе;

б) абавязаць усе дзяржаўныя гаспадарчыя органы і прадпрыемствы рэалізаваць усе адыходы, годныя для пераапрацоўкі, якія не скарыстоўваюцца непасрэдна прадпрыемствамі праз заключэньне спэцыяльных дагавораў непасрэдна з прамысловымі арцелямі або прамсаюзамі;

в) абавязаць дзяржаўныя прадпрыемствы, якія маюць уцільцэхі, перадаваць прамысловай каапэрацыі паводле дагавораў нескарыстаныя адыходы;

г) заключэньне дагавораў непасрэдна памёк трэстамі, прадпрыемствамі, прамысловымі саюзамі і арцелямі на рэалізацыю і куплю адыходаў да канца 1932 г. скончыць не пазьней 1 верасьня.

2. У галіне збыту і цэн

а) Прапанаваць Белкаапрамсавету і Белскаапрамсаюзу зараз-жа забясьпечыць ажыцьцяўленьне пастановы ЦВК і СНК СССР ад 23 ліпеня 1932 году ў частцы рэалізацыі прадукцыі шырокага спажываньня, якая вырабляецца арцелямі з сырцу сваёй загатоўкі (продаж непасрэдна арцелямі на рынках, базарах дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям) па цэнах, якія складаюцца на рынку;

б) абавязаць дзяржаўныя і каапэрацыйныя арганізацыі і прадпрыемствы надалей здаваць свае заказы з давальчаскага сырцу непасрэдна прамысловым арцелям, або праз аб'яднаньні іх саюзы, у парадку двухбаковай гаспадарчай згоды па цэнах, якія ўстанаўляюцца договорам, поўнасьцю спыніўшы практыку цэнтралізаваных абавязковых заказаў;

в) для большай зацікаўленасьці арцеляй, якія вырабляюць будаўнічыя матар'ялы і здабываюць тару, у выкананьні і перавыкананьні сваіх пляноў даць гэтым арцелям права рэалізаваць на сваім потлядзе па цэнах, якія складаюцца на рынку, 10 проц. выпушчанай імі прадукцыі і ўсю прадукцыю, выпушчаную звыш пляну.

Прапанаваць мясцовым партыйным і савецкім органам аказваць усямернае садзейнічаньне і дапамогу прамысловым арцелям у разгортваньні на савецкіх базарах гандлю прадукцыяй сваіх вырабаў у адпаведнасьці з паказанай вышэй пастановай ЦВК і СНК СССР;

г) прадукцыя, якая вырабляецца прамысловай каапэрацыяй з сырцу, што адпускаецца ў плянавым парадку з дзяржаўных фондаў, збываецца непасрэдна арцелямі або прамсаюзамі адпаведным дзяржаўным або каапэрацыйным гандлюючым арганізацыям па ўказаньнях і па цэнах, якія ўстанаўляюцца ўпаўнаважаным камітэту таварных фондаў і рэгуляваньня гандлю пры СНА або па яго даручэньні адпаведнымі народнымі камісарыятамі;

д) прапанаваць Белкаапсаюзу разам з Белкаапрамсаветам і Белкааплеспрамсаюзам у двухдэкадны тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы аб узаемадапамозе паміж спажывецкімі таварыствамі і прамысловымі арцелямі, якія-б забясьпечылі павялічэньне выпуску тавараў шырокага ўжытку і павялічэньне таварных фондаў спажывецкіх таварыстваў;

е) сэктар раздробнага гандлю рэарганізаваць у беларускую арганізацыю раздробнага гандлю прамысловай каапэрацыі «Белкаапрамгандаль», які вядзе гандаль праз сваю сетку прадукцыяй сыстэмы, на падставе дагавораў з арцелямі і саюзамі, а таксама праз набыцьцё тавараў у іншых арганізацыях. У магазынах «Белкаапрамгандлю» прадукцыя прамысловых саюзаў і прамысловых арцеляй шырокага спажываньня, якая вырабляецца з сырцу, што набываецца ў парадку самазагатовак, рэалізуецца па цэнах ня вышэй сярэдня-камэрцыйных.

3. У галіне фінансаў і крэдытаваньня прамысловай каапэрацыі

а) даручыць Белкаапрамсавету і Белкааплеспрамсаюзу разам з беларускай канторай Дзяржбанку ў дэкадны тэрмін перавесьці непасрэднае крэдытаваньне ўсіх арцеляй у банку;

б) прапанаваць Белкаапрамсавету і Белкааплеспрамсаюзу правесьці ў месячны тэрмін неабходныя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць самастойнае распараджэньне арцелямі ўласнымі зваротнымі сродкамі і маемасьцю;

в) лічыць неабходным, каб капітальнае будаўніцтва пізоўкай прамысловай каапэрацыі праводзілася наступным парадкам:

1) Усе рамонтныя работы, дабудаваньне, дазбсталяваньне, набыцьцё абсталяваньня рабілася самастойна арцелямі.

2) Усё новае будаўніцтва лімітнае і ніжэйлімітнае праводзіцца пізавой сеткай па іх плянах толькі пасьля зацьвярджэньня адпаведнымі прамсаюзамі.

3) Усё звышлімітнае будаўніцтва праводзіцца па плянах, зацьверджаных рэспубліканскімі цэнтрамі прамкаапэрацыі (Белкаапрамсаветам і Белкааплеспрамсаюзам);

г) СНК БССР і ЦК КП(б)Б зварачаюць асаблівую ўвагу на неабходнасьць давядзеньня адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў да мінімуму. Скасаваць практыку абавязковых адлічэньняў на ўтрыманьне апарату вышэйстаячых зьвеньняў і на агульна-каапэрацыйныя выдаткі.

Выдаткі на ўтрыманьне апарату вышэйстаячых зьвеньняў, а таксама і на ўсялякія культурныя і агульна-каапэрацыйныя мерапрыемствы ўстанаўляюцца сходамі ўпаўнаважаных арцеляй і саюзаў, [illegible] важнейшую задачу, давядзеньне ўсіх гэтых адлічэньняў да мінімуму;

д) устанавіць у абавязковым парадку рэгулярную справаздачнасьць усіх вышэйстаячых зьвеньняў прамкаапэрацыі перад пэрыферыйнай прамысловай каапэрацыі ня толькі на гадавых зьездах і сходах, але і штомесячна і па паўгодзьдзях. Справаздачнасьць павінна суправаджацца дакладамі рэвізійных камісій аб фінансавай дзейнасьці і выдатках.

Даручыць Белкаапрамсавету і Белкааплеспрамсаюзу ў месячны тэрмін устанавіць парадак і формы справаздачнасьці.

4. У галіне арганізацыйнай перабудовы сыстэмы прамысловай каапэрацыі

Для забесьпячэньня разьвіцьця самадзейнасьці і ініцыятывы асноўнага першапачатковага апэрацыйнага зьвяна прамысловай каапэрацыі-арцелі, вытворчага або збытаспажэнчага таварыства:

а) ліквідаваць усе існуючыя аб'яднаньні Белкаапрамсаюзу і ўсе міжраённыя шматпрамысловыя саюзы;

б) Белкаапрамсаюз рэарганізаваць у беларускі савет прамысловай каапэрацыі «Белкаапрамсавет» (без апэрацыйна-гаспадарчых функцый), на які ўскласьці кіраваньне сыстэмай прамысловай каапэрацыі, вядзеньне арганізацыйнай работы, улік пэрспэктыўнае плянаваньне і прадстаўніцтва прамысловай каапэрацыі ў мясцовых і цэнтральных савецкіх органах і г. д.;

в) ліквідаваць, як самастойную сыстэму, зацыйныя формы прамкаапэрацыі —пастанова Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б (1 стар.).
ПРА СПРАВУ РЭЧЫЦКІХ РАБОТНІКАЎ — пастанова Парткалегіі ЦККП(б)Б (2 стар.).
Да 30 верасьня не пакінуць на полі ніводнага снапа збожжавых (1 стар.).
Уключайцеся ва ўсебеларускую пазыкавую эстафэту (2 стар.).
Барацьба за апал—важнейшая задача партарганізацый (3 стар.).
ЗА МЯЖОЙ:
Напярэдадні антываеннага кангрэсу (4 стар.).
Японскія войскі занялі Нанлін (4 стар.).

харчовую прамысловую каапэрацыю «Белкаапрамхарчсаюз», далучыўшы яе да сыстэмы Белкаапрамсавету;

г) захаваць як самастойную сыстэму лясную, лесахэмічную і дрэваапрацоўчую прамысловую каапэрацыю «Белкааплеспрамсаюз».

Вядзеньне сыстэмы лясной прамысловай каапэрацыі і разьмеркаваньне промыслаў скончыць у двухдэкадны тэрмін;

д) арганізаваць наступныя спэцыяльныя саюзы прамысловай каапэрацыі БССР:

Па скура-абутковым промысьле	4	саюзы
» тэкстыльна-швэйным	5	»
» тарфяным	1	»
» будаўнічых матар'ялаў	1	»
» мэталяапрацоўчым промысьле	1	»
» харчова-смакавым	1	»
» уцілі	1	»
» транспартным	1	»
» бытавым і розным	1	»

а) спэцыялізаваныя саюзы ажыцьцяўляюць арганізацыйнае і гаспадарчае абслугоўваньне пізоўкі (снабжэньне інструментам, сырцом, дапаможнымі матар'яламі), а таксама прадстаўніцтва пізоўкі перад дзяржаўнымі органамі;

ж) прапанаваць Белкаапрамсавету на працягу дэкады устаналіць месца знаходжаньня і раён дзейнасьці спэцыялізаваных прамсаюзаў і падаць на зацьвярджэньне Эканамічнага Савету БССР.

з) прапанаваць Белкаапрамсаюзу ў двухдэкадны тэрмін устанавіць арганізацыйную структуру лясной прамысловай каапэрацыі БССР і падаць на зацьвярджэньне Эканамічнага Савету БССР.

і) абавязаць Белкаапрамсавет фарсаваць правядзеньне рэарганізацыі сыстэмы прамысловай каапэрацыі БССР з тым, каб скончыць яе на працягу месяца.

Лічыць неабходным пасьля скончэньня рэарганізацыі сыстэмы яшчэ ў 1932 г. правесьці справаздачна-перавыбарчую кампанію прамысловай каапэрацыі;

к) усіх работнікаў сыстэмы прамысловай каапэрацыі як кіруючых, так і тэхнічных замацаваць за сыстэмай для скарыстаньня іх на рабоце ў сярэднім і нізавым зьвяне. Катэгарычна забараніць мясцовым партыйным і савецкім органам перакідку гэтых работнікаў на іншую работу.

Для ўзмацненьня кіраўніцтва нізавога зьвяна прамысловай каапэрацыі прапанаваць партарганізацыям умацаваць партыйцамі кіруючыя кадры арцеляй (старшыні і г. д.).

Устанавіць, што кіруючыя кадры арцеляй (старшыні) ня могуць быць зьняты з работы без узгадненьня з аднаведнымі прамсаюзамі, а асноўныя работнікі прамсаюзаў без узгадненьня з рэспубліканскімі цэнтрамі прамысловай каапэрацыі;

л) забараніць усім гаспадарчым, каапэрацыйным і савецкім арганізацыям вербаваць і забіраць рабочую сілу з прамысловай каапэрацыі без аднаведнага ўзгадненьня з Народным камісарыятам працы, з Белкаапрамсаветам і Белкааплеспрамсаюзам;

м) рэспубліканскія і міжраённыя спэцыялізаваныя саюзы прамысловай каапэрацыі кіруюцца непасрэдна цэнтральнымі арганізацыямі (партыйнымі і савецкімі).

Асноўная ўвага раённых, партыйных і савецкіх арганізацый павінна быць накіравана на апэрацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне арцелі і таварыства.

5. У галіне матар'яльна-бытавога абслугоўваньня членаў прамысловай каапэрацыі

а) Прапанаваць Белкаапрамсавету і Белкааплеспрамсаюзу ў двухдэкадны тэрмін распрацаваць пытаньне аб узмацненьні матар'яльнай зацікаўленасьці арцельшчыка ў разьвіцьці апэрацыйна-вытворчай дзейнасьці арцелі і падаць на разгляд камітэту прамысловай каапэрацыі пры Эканамічным Савеце БССР;

б) для паляпшэньня бытавых умоў арцельшчыкаў прапанаваць Белкаапрамсавету і Белкааплеспрамсаюзу распрацаваць мерапрыемствы па пашырэньні ўласнай харчовай базы прамкаапэрацыі праз разгортваньне самазагатовак, арганізацыю прыгарадных гаспадарак, сталовак, адкормачных пунктаў і г. д. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам аказваць прамысловай каапэрацыі максымальную садзейнасьць у правядзеньні гэтых мерапрыемстваў;

в) даручыць Белкаапсаюзу і Белкаапрамсавету ў двухдэкадны тэрмін распрацаваць пытаньне пра парадак абслугоўваньня каапэраваных саматужнікаў спажывецкай каапэрацыяй;

г) прапанаваць беларускаму саюзу кае прамысловай каапэрацыі разам з Белкаапрамсаветам распрацаваць мерапрыемствы для паляпшэньня бытавога абслугоўваньня арцельшчыкаў (дзіцячыя ўстановы, жыллёвае будаўніцтва і г. д.).

6.

а) СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязаць усе мясцовыя арганізацыі і органы прамысловай каапэрацыі весьці рашучую барацьбу з прыватнікамі і спэкулянтамі-перакупшчыкамі прадукцыі саматужнай прамысловасьці і ўжыць захады да іх выкараненьня, а таксама весьці рашучую барацьбу з праяўленьнямі спэкуляцыі ў асобных прамкаапэрацыйных арганізацыях.

Прамысловая каапэрацыя ў сваёй загатоўчай і гандлёвай дзейнасьці павінна выступаць як арганізацыя, якая садзейнічае зьніжэньню раздробных цэн;

б) прапанаваць Белкаапрамсавету і Белкааплеспрамсаюзу распрацаваць парадак вытворчага абслугоўваньня (снабжэньне і збыт) некаапэраваных працоўных саматужнікаў, арганізуючы вытворчыя і снабжэнча-збытавыя таварыствы;

в) лічачы, што асноўнай вытворчасьцю прамысловай каапэрацыі павінны быць тавары шырокага спажываньня, прапанаваць Дзяржпляну, Белкаапрамсавету і Белкааплеспрамсаюзу пры распрацоўцы пляну на 1933 г. прадугледзець давядзеньне вырабу тавараў шырокага спажываньня ня менш, як да 70 проц. агульнага пляну абедзьвюх сыстэм, пры чым мець на ўвазе асаблівае разгортваньне вясковага асартымэнту.

Максымальна стымуляваць разьвіцьцё вырабаў, якія ідуць на экспарт, рэчаў культурнага ўжытку (навучальныя прылады і інш.) і інструмантаў, неабходных для самой прамысловай каапэрацыі і г. д.;

г) прапанаваць Белкаапрамсавету і Белкааплеспрамсаюзу забясьпечыць ажыцьцяўленьне практыкі ўзаемнага абслугоўваньня ўнутры каапэрацыйных зьвеньняў сыстэмы ў галіне загатовак, снабжэньня, паўфабрыкатаў і г. д.;

д) катэгарычна забараніць усім арганізацыям забіраць памяшканьні і абсталяваньне, якія знаходзяцца ў карыстаньні прамысловай каапэрацыі.

Прапанаваць органам пракурорскага нагляду весьці рашучую барацьбу з усялякімі праяўленьнямі парушэньня праў прамысловай каапэрацыі і каапэраваных саматужнікаў і з парушальнікамі рэвалюцыйнай законнасьці ў дачыненьні да прамысловай каапэрацыі.

Для пасьпяховага ажыцьцяўленьня пастаўленых перад прамысловай каапэрацыяй задач і ўзмацненьня партыйнага ўплыву ва ўсіх зьвеньнях прамысловай каапэрацыі ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапануюць усім партарганізацыям узмацніць кіраваньне органамі прамысловай каапэрацыі і ўмацаваць партарганізацыю прамысловай каапэрацыі, перабудаваўшы яе работу і арганізацыйную структуру пад пунктам погляду ўмацаваньня партуплыву ў асноўным зьвяне — прамысловай арцелі.

Усім партарганізацыям і органам прамысловай каапэрацыі разгарнуць шырокую работу па выхаваньні арцельшчыкаў і мабілізацыі іх на пасьпяховае выкананьне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам перад прамысловай каапэрацыяй у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б В. ШАРАНГОВІЧ.

Да 30 верасьня не пакінуць на полі ніводнага снапа збожжавых

ЗВОДКА НКЗБ

аб ходзе ўборкі збожжавых яравых па БССР на 20 жніўня 1932 году

№№ па чарзе	Раёны:	Зжата ў процантах да пляну	Зьвезена і засыпрэтавана ў процентах да зжатага
	ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА		
1.	Бешанковіцкі	62,0	59,0
2.	Аршанскі	53,5	75,0
3.	Дуброўенскі	41,0	30,9
4.	Вушацкі	39,0	—
5.	Сеньненскі	37,7	—
6.	Сіроцінскі	34,3	—
7.	Чашніцкі	33,9	—
8.	Лёзьнянскі	32,8	42,8
9.	Гарадоцкі	31,3	56,7
10.	Полацкі	28,1	43,0
11.	Лепельскі	27,1	94,2
12.	Расонскі	23,1	84,3
13.	Віцебскі	22,7	65,8
14.	Сураскі	21,8	46,6
15.	Асьвейскі	21,4	100,0
16.	Дрысенскі	17,2	2,5
	Усяго па зоне	35,5	46,7
	ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА		
1.	Крычаўскі	100,0	—
2.	Слуцкі	90,2	81,6
3.	Чэрыкаўскі	74,8	73,0
4.	Чырвона-Слабодзкі	73,2	86,3
5.	Пухавіцкі	69,0	67,1
6.	Барысаўскі	65,6	64,7
7.	Смалявіцкі	65,3	81,3
8.	Чавускі	63,4	42,6
9.	Касьцюковіцкі	62,0	62,3
10.	Клімавіцкі	60,0	57,9
11.	Капыльскі	59,6	80,0
12.	Чэрвеньскі	59,2	59,7
13.	Менскі	57,9	65,2
14.	Вузьдзенскі	57,9	68,8
15.	Пражноўскі	55,9	89,9
16.	Асіпавіцкі	54,9	—
17.	Чырвонапольскі	54,4	—
18.	Горацкі	51,5	78,7
19.	Дзяржынскі	50,3	66,9
20.	Магілеўскі	50,3	75,2
21.	Клічаўскі	49,5	83,3
22.	Барысаўскі	46,5	94,8
23.	Талачынскі	46,3	43,3
24.	Ніклоўскі	43,4	60,5
25.	Мсьціслаўскі	43,0	71,9
26.	Быхаўскі	42,5	—
27.	Плешчаніцкі	42,2	61,0
28.	Заслаўскі	41,8	73,7
29.	Бяломльскі	39,8	—
30.	Крупскі	39,0	—
31.	Старадарожскі	35,7	87,5
32.	Лагойскі	30,9	70,9
33.	Бялыніцкі	26,6	4,6
	Усяго па зоне	54,6	90,0

ЧОРНАЯ ДОШКА

За абломаўскія тэмпы і нежаданьне мабілізаваць масы на сваячасовае скончэньне ўборкі яравых заносім на чорную дошку наступныя раёны:

Па паўднёвай зоне:

1. **Уваравіцкі**—выканаў плян уборкі на 36,2 проц.

Па цэнтральнай зоне:

1. **Бялыніцкі**—26,6 проц.

Па паўночнай зоне:

1. **Дрысенскі**—17,2 проц.
2. **Асьвейскі**—21,4 проц.
3. **Сураскі**—21,8 проц.
4. **Віцебскі**—22,7 проц.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За сапраўды бальшавіцкія тэмпы мабілізацыі мас у часе ўборачнай заносім на чырвоную дошку:

1. Крычаўскі раён—выканаў плян уборкі на 100 проц.

ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА		
1. Брагінскі	89,6	76,0
2. Старобінскі	82,5	—
3. Хойніцкі	81,1	88,0
4. Рагачоўскі	73,9	75,6
5. Жлобінскі	73,2	94,8
6. Глускі	72,6	90,5
7. Парыцкі	69,6	100,0
8. Бабруйскі	68,8	97,5
9. Кармянскі	68,0	59,9
10. Мазырскі	67,0	76,2
11. Любаньскі	60,7	86,2
12. Церахаўскі	60,2	79,6
13. Лоеўскі	59,7	—
14. Веткаўскі	57,1	89,9
15. Жыткавіцкі	56,3	98,6
16. Рэчыцкі	53,4	69,2
17. Гомельскі	52,1	79,5
18. Тураўскі	52,0	84,9
19. Бельскі	50,8	85,6
20. Буда-Кашалёўскі	50,7	98,2
21. Пятрыкоўскі	49,6	—
22. Камарынскі	44,7	90,9
23. Нараўлянскі	44,7	76,4
24. Лельчыцкі	39,7	63,2
25. Чачэрскі	39,1	—
26. Уваравіцкі	36,2	74,6
Усяго па зоне	61,3	74,5
Усяго па БССР	52,4	63,2

Аб справе рэчыцкіх работнікаў

Пастанова парткалегіі ЦКК КП(б)Б ад 4 жніўня 1932 г.

Заслухаўшы даклад члена парткалегіі ЦКК КП(б)Б тав. Пасюкевіча аб выніках абследавання рэчыцкіх спраў, парткалегія канстатуе, што з боку рэчыцкіх кіруючых раённых органаў—РК, райвыканкому,—шрача «очковтирательства», аб чым адзначана ў рэзалюцыі ЦК КП(б)Б, дапушчан рад фактаў апартуністычных скажэнняў генеральнай лініі партыі, асабліва «лявацкіх» загібаў, якія выяўлены ў работе раду сельсаветаў і парт'ячэек (пераабкладаньне штрафаў, цьвёрдымі заданьнямі і г. д.), на што кіруючыя рэчыцкія органы не звярачалі ніякай увагі, прымірэнча адносіліся да яўных апартуністаў.

У партарганізацыі адсутнічала крытыка і самакрытыка, у выніку чаму ня былі выкрыты своечасова самой партарганізацыяй як факты апартуністычных скажэньняў генеральнай лініі партыі, так і факты сямейнасьці і групоўчыны, на глебе якой адбыўся рад злоўжываньняў, незаконных спагнаньняў грошай РК і райвыканкомам з гаспадарчых і савецкіх арганізацый, бесконтрольнае расходованьне іх (райкомам узята каля 20 тыс. руб. з розных гаспадарчых арганізацый).

На падставе матар'ялаў парткалегія пастанаўляе:

1. Тав. Мазуру, былому сакратару рэчыцкай партарганізацыі, за «очковтирательство», прымірэнчыя адносіны да апартунізму, групоўчыну, сямейнасьць, незаконнае спагнаньне грошай з гаспадарчых і савецкіх органаў, моманты антыпартыйных і неэтычных паводзін—абвясьціць суровую вымову, зьняць з работы райза, забараніць займаць адказныя савецкія пасады на працягу двох год. Выкарыстаць на рабоце па спэцыяльнасьці.

2. Тав. Рымаву—загадчыку рэчыцкага райза — за апартуністычнае кіраўніцтва райза, «очковтирательство», незаконнае вядзеньне грашовых спраў і няпічырасьць перад кантрольнымі органамі—абвясьціць суровую вымову, зьняць з работы райза, забараніць займаць адказныя савецкія пасады на працягу двох год. Выкарыстаць на рабоце па спэцыяльнасьці.

3. Тав. Казакоткіну—дырэктару дзяржбанку рэчыцкага аддзяленьня за сказіньне дырэктыў партыі і ўраду па распаўсюджаньні пазыкі, за перазагаваньне, будучы старшынёй рэўкамісіі РК КП(б)Б, на незаконнае пазычаньне сродкаў райкомам у гаспадарчых арганізацый і хаатычную пастаноўку грашовай справаздачнасьці, няпічырасьць перад кантрольнымі органамі—абвясьціць суровую вымову, зьняць з работы кіраўніка аддзяленьня дзяржбанку.

4. Тав. Лазараву—загадчыку райфа—абвясьціць вымову за перазагаваньне на незаконнае пазычаньне грошай у гаспадарчых арганізацый і бесправаздачнае расходованьне іх.

5. Тав. Плоткіну—сакратару райвыканкому—за перазагаваньне на незаконнае пазычаньне райвыканкомам грошай у розных арганізацый і нядбайнасьць у вядзеньні справаздачнасьці гэтых сродкаў—абвясьціць вымову.

6. Тав. Хамліцкаму—кіраўніку справамі РК—за няпічырасьць перад кантрольнымі органамі, нядбайнасьць да працы—абвясьціць вымову і зьняць з работы кіраўніка справаў райкому.

7. Справу б. старшыні рэчыцкага райвыканкому тав. Мацкевіча і яго намесьніка тав. Іванова ў сувязі з іх адсутнасьцю разглядзець дадаткова.

8. Катэгарычна папярэдзіць кіраўнікоў гаспадарчых і савецкіх органаў (леспрамгас, райкаапсаюз, райзаг, саюзхлеб і інш.), што ў выпадку паўтарэньня з іх боку водпуску незаконна сродкаў РК і райвыканкому, яны будуць прыцягвацца да партыйнай і судовай адказнасьці.

9. У сувязі з цэлым радам указаньняў т.т. на злоўживаньні б. гарснабу ў Рэчыцы тав. Цесіна, прасіць пракурора рэспублікі дакладна расьсьледаваць гэту справу.

10. Даручыць усім РАЙКК зьвярнуць асаблівую ўвагу на расходованьне райвыканкомам па-забюджэтных сродкаў і незаконнае РК грашовых сродкаў у гаспадарчых арганізацый для сваіх патрэб і аб усіх фактах своечасова сыгналізаваць перад ЦКК.

Сакратар партколегіі ЦКК КП(б)Б ДАМБРОЎСКІ.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

выкананьне дадатковай праграмы па шырспажыву па Наркамлёгпрому за першую дэкаду жніўня

Галіны прамысловасьці	Плян на жніўень	Фактычнае выкананьне за 10 дзён жніўня	Проц. выкананьня мес. пляну
Гарбарная	29,0	12,2	42,1
Абутковая	32,4	5,4	16,6
Швэйная	645,9	186,2	28,8
Разам	1.065,9	275,8	25,9

Гэта зводка сьведчыць аб тым, што дадатковая праграма па шырспажыву па прамысловасьці НКЛП выконваецца не здавальняюча.

Як бачым са зводкі, асабліва адстае абутковая прамысловасьць, якая выканала толькі 16,6 проц. месячнай праграмы. З па асобных прадпрыемстваў гэтай галіны прамысловасьці ідзе апошній па выкананьні праграмы па шырспажыву віцебская абутковая фабрыка, якая за 10 дзён жніўня выканала толькі 11,2 проц. пляну. Ударнымі тэмпамі працуе рымарная фабрыка, якая за 10 дзён жніўня дала 56,7 проц. выкананьня праграмы.

Упераадзе ідзе гарбарная прамысловасьць, якая за 10 дзён жніўня выканала сваю вытворчую праграму па шырспажыву на 42,1 проц. Віцебская гарбарня дала выкананьне 57,3 проц. пляну, Магілеўская — 44 проц.

Швэйная прамысловасьць за 10 дзён жніўня выканала дадатковы плян па шырспажыву на 28,8 проц. Па гэтай галіне прамысловасьці асабліва адстаюць фабрыка імя Крупскай, якая выканала ўсяго толькі 8,6 проц. пляну, і фабрыка «Прафінтэрн»—11,4 проц. Ідзе ўпераадзе швэйная фабрыка «Камінтэрн», якая выканала за 10 дзён 50,1 проц. праграмы. Добра працуе кушнерная фабрыка, якая выканала 38,6 проц. месячнай праграмы.

Рэалізацыя пазыкі „4 завяршальны"

УКЛЮЧАЙЦЕСЯ ВА ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ ПАЗЫКОВУЮ ЭСТАФЭТУ

Абвяшчаецца ўсебеларуская пазыковая эстафэта

Для завяршэньня рэалізацыі пазыкі на аснове пастановы ЦК КП(б)Б абвешчана ўсебеларуская пазыковая эстафэта.

Агульнае кіраўніцтва эстафэтай ускладзена на сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР тав. Гіляковіча, а ў раёнах на загадчыкаў культпрошаў РК КП(б)Б

Старт даецца 25 жніўня, фініш — 15 верасьня. Раённыя арганізацыі кажны зараз-жа ўключыцца ў правядзеньне эстафэты.

Прырост за пяцідневку толькі на 0,2 проц.

Прырост сумы рэалізаванай пазыкі за трэцюю пяцідневку жніўня на 0,2 проц. гаворыць аб амаль поўным спыненьні работы ў гэтым напрамку. Карэспандэнцыі з месц сьведчаць, што некаторыя сельскія саветы ніякай работы не праводзяць як па рэалізацыі, так і па афармленьні падпіскі, а некаторыя зусім спынілі работу, лічачы рэалізацыю пазыкі скончанай. Між тым, заданьне па горадзе яшчэ недавыканана на 9,2 проц., а па вёсцы выкананьне кантрольнай лічбы складае толькі 29,6 проц.—па калгасным сэктары—63,9 проц., па аднаасобным—толькі 2,9 проц.

Зьмяншэньне тэмпаў рэалізацыі, пры наяўнасьці такога вялікага адставаньня, можна тлумачыць толькі недаацэнкай гэтай работы з боку некаторых раённых фінансавакредытных установаў, а таксама сельскіх саветаў і партыйных ячэек. Настрой самацёку заўважваецца і ў некаторых цэнтральных установах. **Кіраўніцтва ашчадкас і дзяржгрэзыту, ня гледзячы на налучэньне недавыкананьня рэалізацыі пазыкі, адпусьціла ў адпачынак амаль усіх асноўных работнікаў.**

Ня лепш стаіць справа і з афармленьнем падпіскі. З агульнай сумы рэалізацыі сярод рабочых і служачых афармлена толькі 65,9 проц. падпіскі, а сярод калгаснікаў—28 проц. Па горадзе-ж і па вёсцы разам афармленьне падпіскі складае толькі 61,2 проц. агульнай сумы. Гэта ў той час, калі па ўсёй рэалізаванай суме павінны былі паступаць грашовыя ўзносы. Горш таго. Як паведамляюць з Бабруйскага раёну, **у працэсе афармленьня падпіскі рэалізацыя пазыкі па калгасным сэктары зьменшылася на 50 проц. Гэта ёсьць нішто іншае, як простае «очковтирательство», якое было дапушчана з боку фінансава-крэдытных установаў Бабруйскага раёну пры інфармаваньні аб ходзе рэалізацыі пазыкі.**

Гэты факт высоўвае з усёй сур'ёзнасьцю **необходнасьць самай уважлівай праверкі выніку рэалізацыі па ўсіх раёнах і, як першачарговую задачу, побач з далейшым узмацненьнем тэмпаў рэалізацыі, скарачэньня афармленьня падпіскі ў самы кароткі тэрмін.**

Зводка рэалізацыі пазыкі „Чацьвертага завяршальнага году пяцігодкі"

процантах да заданьня

НАЗВА РАЁНАЎ	Па гораду	Сярод калгаснікаў	Разам па вёсцы	УСЯГО
Раёны, якія выканалі план рэалізацыі пазыкі поўнасьцю				
1. Жыткавіцкі	160,7	87,5	58,3	118,1
2. Дзяржынскі	139,0	98,0	68,0	109,4
3. Заслаўскі	139,1	100,0	75,7	108,5
Раёны, якія набліжаюцца да выкананьня заданьня				
1. Дрысенскі	148,4	60	33,8	98,8
2. Менскі	98,8	80,9	63,2	97,5
3. Аршанскі	104,9	98,3	61,6	94,1
4. Клімавіцкі	93,0	121,0	92,2	92,6
5. Гомельскі	96,1	72,5	26,3	91,3
6. Віцебскі	90,2	94,1	67,8	88,8
7. Мазырскі	104,2	76,0	34,0	83,9
Раёны, якія ганебна цягнуцца ў хвосьце				
1. Клічаўскі	85,4	67,6	14,7	46,0
2. Чэрвеньскі	64,8	67,3	18,4	46,0
3. Чачэрскі	105.2	32,4	11,3	45,5
4. Нараўлянскі	98,3	38,8	11,2	45,1
5. Пранойскі	76,4	38,3	22,2	43,2
6. Чырвонапольскі	102,9	49,1	23,6	48,1
7. Церахаўскі	88,2	62,3	23,9	48,1
8. Брагінскі	61,8	65,1	24,9	42,9
9. Веткаўскі	82,1	40,8	10,8	41,4
10. Сураскі	64,7	50,0	18,9	41,1
11. Кармянскі	97,8	49,0	19,8	40,4
12. Лоеўскі	73,8	47,1	20,8	39,0
13. Гарадоцкі	66,2	32,8	15,2	38,8
14. Бешанковіцкі	63,6	24,3	14,2	36,1
15. Чавускі	70,3	44,8	13,1	33,7
ПА БССР:	90,8	63,9	29,6	72,5

УВАГА: Астатнія раёны займаюць сярэдняе месца.

Не дапускаць зьніжэньня падпіскі пры афармленьні

БАБРУЙСК, 18. (БЕЛТА). У галіне мабілізацыі сродкаў Бабруйшчына знаходзіцца у глыбокім тыле. Квартальнае заданьне выканана толькі на 13,8 проц. Па каапэрацыйнай сыстэме рэалізацыя пазыкі не перавышае ў сярэднім 20 проц. заданьня. Недапушчальна ганебна ідзе паступленьне абавязковых плацяжоў на вёсцы. Плян па гэтым відзе плацяжоў выканан толькі на 1,7 проц.

Такія сельсаветы, як **Прудзінскі, Казуліцкі, Бярэзьніцкі,** яшчэ нават не прыступілі да выкананьня фінпляну 3-га кварталу.

Пад пагрозай зрыву знаходзіцца афармленьне пазыкі і паступленьне чарговых узносаў. Замест 250 тысяч рублёў паступіла да гэтага часу 90 тысяч рублёў. Пры афармленьні падпіска на калгасным сэктары зьнізілася больш чым на 50 проц.

Змагацца за павышэньне працдысцыпліны

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). У першым паўгодзьдзі барысаўская вапалкавая фабрыка «Пралетарская перамога» дала ня дрэнныя вытворчыя паказальнікі. Прамфінплян па выробу прадукцыі на ўпутраны рынак і на экспарт перавыкананы. Гэтыя вытворчыя посьпехі тым больш паказальны для фабрыкі, што яна ўпяршыню ў пераўчаньні з мінулымі гадамі дасягнула ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня вытворчай праграмы.

Перамогі фабрыкі абумоўлены перабудовай у асноўным работы партыйнай арганізацыі і адміністрацыйна-гаспадарчага кіраўніцтва ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і абстаноўкай.

Перанясеньнем цэнтру цяжару партыйна-масавай работы ў цэх, брыгаду, узмацненьнем партсілямі вядучых вытворчых зьвеньняў забясьпечваецца штодзённы ўплыў парт арганізацыі на рабочыя масы. Парт'ячэйкі своечасова рэагуюць на неадаровыя настрої пазасобных, найбольш адсталых груп рабочых.

Партыйная арганізацыя фабрыкі сур'ёзна змагаецца за павышэньне авангардняй ролі камуністаў на вытворчасьці. Перыядычна раз-два ў месяц праводзіцца праверка выкананьня камуністамі вытворчага заданьня. Мэтадамі выхавачай работы падтрымліваецца адстаючыя, вядзецца барацьба з ліквідарніцтвам. На фабрыцы ёсьць пасобныя партгрупы, якія набылі навалі дадатны вопыт у сваёй рабоце па забясьпячэньні пярэдніцтва ў выкананьні прамфінпляну. Вельмі важны пачын партгалектыву—дыферэнцыяваны падыход у разгортваньні палітвыхавачай работы сярод розных груп рабочых.

Аднак, усё-ж узятыя тэмпы работы ў першым паўгодзьдзі не замацаваны. Крывая выкананьня прамфінпляну за ліпень і першую дэкаду жніўня пайшла ўніз. Заданьне па выробу прадукцыі па мясцовым рынку і экспарт у агульнай складанасьці выканана толькі на 90 проц. Плянавыя меркаваньні па павышэньні прадукцыйнасьці працы выкананы толькі на 96,79 проц. Праўда, вытворчая праграма на трэці квартал некалькі павышана. Але прычына недавыкананьня пляну заключаецца ня ў гэтым. Тэхнічныя магчымасьці фабрыкі дазваляюць яшчэ большае павышэньне пляну. За апошні час значна ўзрасла дзякучасьць рабочых. Таксама значна павялічылася колькасьць прагулаў па няўважлівых прычынах. Кіраўніцтва фабрыкі аслабіла ўвагу справе арганізаванага набору рабочай сілы і замацаваньню палучкай.

Змагацца за спыненьне дзякучасьці рабочай сілы, за яе замацаваньне на прадпрыемстве, г. зн. змагацца за далейшае паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых, змагацца ўсімі сродкамі грамадзкай узьдзейнасьці з лягучкамі і прагульшчыкамі.

На справе-ж мы маем такое становішча, што каля 20 проц. рабочых бярэзінскага камбінату не забясьпечаны жыльлёвым памяшканьнем. Грамадзкае харчаваньне на прадпрыемствах як след не наладжана.

У сувязі з тым, што прагулы па няўважлівых прычынах за ліпень і першую дэкаду жніўня амаль дасягаюць кольасьці прагулаў усяго першага паўгодзьдзя, пытаньне ўмацненьня працоўнай дысцыпліны высоўваецца перад партыйнымі, прафсаюзнымі арганізацыямі фабрыкі, як важнейшая задача. Неабходна ўзмацніць выхавачую работу, асабліва сярод новага складу рабочых. Трэба рашуча пакончыць з недаацэнкай задач асобнай работы сярод жанчын-работніц фабрыкі.

Разгортваньне масавай растлумачальнай работы низавымі партзвеньнямі, павышэньне вядучай ролі камуністаў на вытворчасьці, барацьба партарганізацыі за ажыцьцяўленьне 6 сталінскіх умоў выраваюць посьпех далейшага выкананьня прамфінпляну.

Я. Ів.

Месячнік скончыўся, а прарыў застаўся

Яшчэ ў чэрвені Крычаўскі РК КП(б)Б па закладу трыкутніка **фасфарытнага заводу** аб ходзе выкананьня прамфінпляну канстатаваў, што магчымасьці для поўнага ажыцьцяўленьня праграмы ёсьць і прапанаваў правесьці месячнік ліквідацыі прарыву.

З 5 ліпеня па 5 жніўня на заводзе быў абвешчан месячнік штурму. Стварылі штаб. Але з першых дзён штаб ня ўзяў сапраўдных тэмпаў у выкананьні пастаўленых перад ім задач. Замест непасрэднага апэрацыйнага кіраўніцтва ў цэхах і брыгадах ён выносіў пустыя пастановы, якія засталіся на паперы. Абавязкі, якія ўскладаліся на пасобных таварышоў, ня выконваліся і не правяраліся. Напрыклад, загадчык мэханічнай майстэрні **тав. Клютко** нядбайна адносіцца да рамонту мэханізмаў, з прычыны чаго завод робіць вялікія прастоі. Тэхнічны кіраўнік таксама зрывае работу. Мэханік **Амэлічаў** замест наладжаньня работы займаецца рвацтвам, патрабуе за кожны рамонт узнагароды.

Парткіраўніцтва і прафработа па заводзе не адчуваюцца. Рабочком на чале са старшынёю тав. **Зінейко** замест таго, каб мабілізаваць масы на пасьпяховае правядзеньне месячніка, шляхам разгортваньня масавай работы па мабілізацыі рабочых на ліквідацыю ганебнага адставаньня,—бязьдзейнічае.

У выніку самацёку ў рабоце, месячнік быў сарваны. Больш таго, становішча заводу пагоршылася. Калі чэрвень даў выкананьне праграмы на 55 проц., дык за ўдар ны месяц — ліпень—праграма выканана толькі на 47 проц.

Рабочыя павінны зьняць з сябе ганебную пляму. Усе магчымасьці для таго, каб аздаравіць працу заводу, ёсьць. Іх неабходна ператварыць у жыцьцё.

Сьцержань.

В. ТАРСКІ

„БУДУЧЫНЯ РОБІЦЦА ІМГЛІСТАЙ І НЯПЭЎНАЙ"...

„Цуд над Віслай"

Па сутнасьці кажучы, там ніякага «цуду» ня было. Супроць Чырвонай арміі — босай, абарванай, галоднай былі мабілізаваны ўсе сілы Пілсудзкага, вельмі значна ўзмоцненыя сіламі саюзных дзяржаў. Пад напорам **сканцэнтраваных сіл міжнароднай контр-рэвалюцыі** Чырвоная армія прымушана была адступіць.

Вайна з Польшчай, справакаваная, накінутая нам Антантай, ня была чым-небудзь **выпадковым.** «Паход» Пілсудзкага на Кіеў быў чарговым зьвяном у ланцугу **антысавецкай інтэрвэнцыі.** Калі Пілсудзкі распачынаў з благаслаўленьня і пад націскам **Антанты** свой «паход», яго акрылала сьмелая надзея: «вось ён, Пілсудзкі, напісе Саветам руйнуючы ўдар з Захаду, адным размахам адкіне гэтых галодных, абарваных барбораў-бальшавікоў за Маскву і выканае гістарычную місію — абароніць эўрапейскую цывілізацыю».

А вышла крыху ня так. Пілсудзкі, замест Масквы, апынуўся пад Варшавай, апынуўся на валасок ад бяздоньня. «Калі нас адарвалі ад зоны, у нас не хапіла сіл, мы не маглі ўзяць Варшаву і дабіць польскіх памешчыкаў, белагвардзейцаў і капіталістаў, але наша армія паказала ўсяму сьвету, што Версальскі дагавор ня ёсьць такая сіла, якой яго прадстаўляюць... Чырвоная армія паказала, што гэты Версальскі дагавор ня так і моцны» (Лянін). *).

Імкненьні ў гэтым заключаецца асноўны зьмест падзей. Канцэнтруючы пад Варшавай на данамогу Пілсудзкаму свае сілы, Антанта забараняла **ВЭРСАЛЬСКУЮ СЫСТЭМУ.** Становішча было грознае для міжнароднай буржуазіі. На спатканьне пераможнаму наступленьню Чырвонай арміі ўзьнімалася з Захаду сустрэчная хваля **пралетарскіх рэвалюцый,** хваля, якая магла зьмесьці разам з Вэрсальскай сыстэмай **панаваньне буржуазіі.**

Таму гэты момант зьяўляецца дамінуючым у падзеях, што разгарнуліся пад Варшавай, таму гэты, а ня іншы момант падае ім міжнароднае значэньне.

Чырвоная армія з-пад Варшавы адступіла, але гэта ні ў якай ступені не гаворыць аб тым, што Пілсудзкі перамог. Мяжа, устаноўленая Рыскім трактатам, лягла прыблізна **на 50 кілёмэтраў далей на Захад,** чым мяжа, прапанаваная Саветамі ў імя міру **да «паходу»** Пілсудзкага. **«Гэтага уроку польскія пеншчыкі і капіталісты, бязумоўна, не забудуць, яны разумеюць, што яны зарваліся, цяпер яны атрымалі мір на меншай тэрыторыі, чым ім прапанавалася раней»** (Лянін). *)

Гэта, аднак, не перашкаджае польскай буржуазіі хваліцца сваім «цудам над Віслай» і шумець кожны год з гэтай прычыны. Бязумоўна, гэты шум ня зьяўляецца самамэтай. **Ён абумоўлен сённяшнімі палітычнымі мэтамі польскага імпэрыялізму.** Польскія паны — буржуазія і памешчыкі — не забыліся, не закінулі сваіх заветных ідэалаў «вялікай Польшчы». Ім мярэшчыцца і «польскі» Менск, і «польскі» Кіеў, і гоман хваль Чорнага мора. Таму ў дзень «цуда над Віслай» яны стараюцца пашумець, дань магчымасьць шырэй гульнуць нацыяналістычным пачуцьцям; таму яны стараюцца ў імя надыходзячай інтэрвэнцыі выкарыстаць гэты дзень для мабілізацыі **ўсіх варожых пралетарскай рэвалюцыі сіл.**

Таму, з году ў год, калі надыходзілі жнівеньскія дні, рука пілсудчыкаў грозна, пафанысцку ўзьнімалася ўгару, а з вусны падаў загад на арміі інтэрвэнтаў:

«Няхай вас ня зломіць МІР, так як на зламала вайна. ЛЕГІЁНЫ! БАРАЦЬБА ЯШЧЭ НЕ ЗАКОНЧАНА!» *)

1930 г.

Гэта быў год, калі пасьля **частковай, гнілой** «стабілізацыі» крызіс пасапраўднаму толькі распачаўся.

Дзесяцігодзьдзе «цуду над Віслай» польскі фашызм сустракаў падзвычай шумна і ўрачыста. Буржуазная прэса ўсіх колераў і адценьняў вяла некалькі тыдняў «цудоўную» кампанію. Газэты стракацелі крыклівымі артыкуламі, напісанымі стылем «ура». Польскі фашызм энэргічна мабілізаваў свае сілы для надыходзячай барацьбы. Распаленая да апошніх межаў нацыяналістычная дэмагогія павінна была **адцягнуць** шырокія народныя масы ад нарастаючага рэвалюцыйнага руху.

У «цудоўнай» кампаніі, якая разгарнулася, адна з першых скрыпак, побач з афіцыёзам **«Газэтай Польскай»** належыла «крэсоваму» рыцару польскага фашызму — **«Кур'еру Віленскаму».** З «віленскага бастыёну» ліцелі на адрасу саюзнікаў проста гатовыя акты абвінавачаньня. Што? Чаму? Спраўда, бачыце, вось у чым:

«Эўропа не ўяўляла сабе ўсёй небясьпекі сітуацыі (у жнівеньскія дні 1920 г.— РЭД.) і не разумела, што паражэньне Польшчы ёсьць пачатак УСЕЭЎРАПЭЙСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ і немагчымых да прадбачэньня гістарычных катастроф».

Паказваючы і падкрэсьліваючы на кожным кроку, што польскія легіёны пад Варшавай абаранялі «эўрапэйскую цывілізацыю» ад налёту «чырвоных гуннаў», было, зразумела, выгадным «здзіўцтва» Польшчы, хоць і выдуманае. Гэта прыемна казытала **нацыянальную гордасьць** буржуазных і дробна-буржуазных мас, а таму было карысным і на данным этапе.

Таму з такім «елейным энтузіязмам» цэнтральны орган пілсудчыкаў «Газэта Польска» зьвяртала на сваіх старонках водгук газэты францускага імпэрыялізму «Эр нувэль» аб бітве над Віслай. «Эр нувэль» пісала:

«Ня трэба сумняваецца, што перамога Пілсудзкага абаранила Польшчу РАЗАМ З ЦЫВІЛІЗАЦЫЯЙ УСІХ ЗАХОДНІХ КРАЁЎ, якія былі-б залітыя чырвонай паводкай, калі-б польская плаціна ня вытрымала напору».

16 жніўня 1930 году «Газэта Польска» вышла з аншлягам **«Магутная маніфэстацыя абаронцаў бацькаўшчыны ў 10-ю гадавіну адпору БАЛЬШАВІЦКАЙ навалы».** 17 таго-ж месяцу п'яны ад некалькі-тыдневага «цудоўнага» крыку **«Кур'ер Віленскі»** апавяшчаў паляку свету, што: **«Гістарычнае існаваньне Польшчы — ЗАБЯСЬПЕЧАНА!»**

1931 г.

На «дэмакратычнай» Рэчы Паспалітай, атрымліваючы перамогу за перамогай, крочыць **пан Крызіс.** Ня дымяцца трубы фабрык, змоўкі капальні.

«Цуды» творацца над усімі рэкамі Польшчы, вялікія, векапомныя «цуды».

Куды падзеліся гэтыя натоўпы, якія на кліч «Польшча ад мора да мора — няхай жыве!» дзёрліся аж да хрыпаты? Пад напорам голаду, самага звычайнага чалавечага голаду, **калі «бацькаўшчына» ў імя клясавых інтарэсаў буржуазіі кідае лёзунг «цясьней пасы»,** — бязьвэйвацца нацыяналістычны дурман. Народныя масы ўсё больш і больш выразна бачаць, што ў 1920 годзе на берагох Віслы іх Пілсудзкі самым подлым чынам ашукаў. Яны бачаць, што ў **дваццатым** яны ваявалі за **фэбрыкі для капіталістаў, за маёнткі для памешчыкаў, за новыя ланцугі для сябе.**

Прапоўныя, якіх у **дваццатым** годзе абдурылі сацыял-патрыёты з пад сьцягоў ППС, на ўласнай, горкай практыцы пераканаліся, што іх уцягвалі ў барацьбу за права капіталістаў і фабрыкантаў на эксплёатацыю, за клясавае панаваньне буржуазіі, за голад.

Сялянскія масы, замест абяцанай зямлі, атрымалі від «бацькаўшчыны» падатковых прэс, які выціскае з іх апошнія сокі, а замест волі — «польскі парляманцкі» бічук памешчыка і палікрэйскую сякаваціну.

А з Усходу даходзілі хвалюючыя весткі. Там рабочы ня верае, што такое беспрацоўе, селянін забыўся, што значыць зямельны голад. З Усходу далятае радасны гоман будаўніцтва, гул трактараў, гром турбін.

Як не падобна цяпер вяўлічная прэса польскага фашызму да тэй прэсы, якая ў **1930 годзе** ўзьняла такі «цудоўны» шум.

Калі «Газэта Польска» ў мінулым годзе крычала аб «адпоры бальшавіцкай навалы», аб **«выратаваньні Эўропы ад РЭВАЛЮЦЫІ»,** дык сёлета «Газэта Польска» прымушана схаваць «цуды» ў мех:

«Польска-расійская вайна была ліквідацыяй канфлікту з ДАЎНЕЙШАЙ ЦАРСКАЙ РАСІЯЙ і ня мела ніякай сувязі з рэвалюцыйнымі зьменамі ў НОВАЙ Расіі.

... Вайна, пёс якой быў вырашан жнівеньскай перамогай, НЯ МАЕ НІВОДНАГА СУТЫЧНАГА ПУНКТУ З КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ ДЗЕЯНЬНЯМІ, што разьвіваліся на межах Расіі ў гадох 1918-1920». *).

І характэрна, што «Газэта Польска» ў сваім выступленьні ня **адзінокай. «Кур'ер Віленскі»** яшчэ 9 жніўня з трывогай пісаў:

«БУДУЧЫНЯ РОБІЦЦА ШТО РАЗ БОЛЬШ ІМГЛІСТАЙ І ШТО РАЗ БОЛЬШ НЯПЭЎНАЙ».

А ў гадавіну «цуду над Віслай» бедны рыцар з «віленскага бастыёну» проста паміраў ад пэсымізму, сьцьвярджаючы, што

«фронт, праломены і разьбіты ў 1920 годзе, НЕ ПЕРАСТАЎ ІСНАВАЦЬ...

Барацьба, якая здавалася нам закончанай у 1920 годзе над берагамі Віслы, НЕ ЗАЦІХЛА, ЯК СПЫКІЛАСЬ НІ НА ХВІЛІНУ, І СЕКЬНЯ ПРАДСТАЎЛЯЕЦЦА Ў ВЫСОКІМ НАПРУЖАНЬНІ СВАЁЙ ВАРОЖАЙ СІЛЫ. Трэба спыніцца, наколькі за мінулыя адзінаццаць год узмацніліся ЯНЫ там, на прыволскіх стэпах і наколькі мы? Колькі саюзьнікаў здабылі мы і колькі яны? На жаль, ЯНЫ ЗДАБЫЛІ ШМАТ...

Чырвоная пяціпутная зорка прыцягвае да сябе, як магніт, усіх незадаволеных сьвету, розных колераў скуры і розных геаграфічных шырынь».

Але гэта мы — бальшавікі. А героі «Цуду над Віслай»?

«Як адзінаццаць год назад, так і цяпер, мы стаім на небясьпечным бастыёне, А ПАД НАГАМІ ПАЛАЕ ЗЯМЛЯ». *).

Сумныя, забойча-пэсымістычныя перспэктывы суліць польскай буржуазіі будучыня.

ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ

На падставе простага супастаўленьня гэтых дзьвёх гадавін «цуду над Віслай» мы можам гаварыць аб вялікім працэсе разьвіцьця, які іх дзеліць, аб тых сацыяльных зрухах у Польшчы, што абумовілі настолькі розны характар дзьвюх сумежных гістарычных дат.

Наступны—**1932 год**—не затрымаў гэтых гістарычных працэсаў, а прынёс іх далейшае разьвіцьцё і паглыбленьне. Надзеі на «хуткае скавачэньне» крызісу — **рухнулі.** «Праоркі» надыходу «лепшых часоў» апынуліся на мялі.

Тэмп радыкалізацыі і рэвалюцыянізаваньня народных мас стаў яшчэ больш шпаркім. Сярод іх яшчэ больш узрасла папулярнасьць сацыялістычнага будаўніцтва і сымпатыі да СССР. Імпэрыялістычна-інтэрвэнцыянісцкія ідэі польскай буржуазіі ўжо ня толькі ня сустракаюць здавальненьня сярод працоўных, а, наадварот — усё часьцей і часьцей натыкаюцца на самы **рашучы адпор.**

Рэвалюцыйныя працэсы ўпутры краіны, пагаршэньне міжнароднага становішча Польшчы і пасьляўоўная палітыка міру з боку Савецкага саюзу — прымусілі польскі ўрад найсьці **нават** на падпісаньне пакту аб ненападзе з СССР.

Сёлета-ж, у гадавіну «цуду над Віслай», **«Газэта Польска»** яшчэ больш выразна падкрэсьліла сказанае ў мінулым годзе:

«Для Польшчы вайна, што закончылася дванаццаць год назад, была разрахункам з Расіяй, З РАСІЙСКАЙ ІМПЭРЫЯЙ, З СІТУАЦЫЯЙ, СТВОРАНАЙ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII І ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТАГОДЗЬДЗЯ.

У часе вайны ў нас ні разу не нарадзілася думка аб інтэрвэнцыі ва ўнутраныя справы Расіі, НІКОЛІ НЕ ПАЎСТАЎ НАМЕР БАРАЦЬБЫ З РУСКАЙ РЭВАЛЮЦЫЯЙ». *).

На падставе гэтых некалькіх цытат і ўсяго сказанага вышэй мы можам канстатаваць:

1. З прычыны глыбокай **радыкалізацыі і рэвалюцыянізаваньня** працоўных мас, якія з кожным днём усё больш актыўна выступаюць пад кіраўніцтвам **камуністычнай партыі** на барацьбу з дыктатурай буржуазіі, супроць голаду, тэрору і вайны, у абарону СССР, — магчымасьці польскага фашызму для разгортваньня нацыяналістычнай, антысавецкай дэмагогіі вакол «цуду над Віслай» — **значна звузіліся.**

2. «Цуд над Віслай» — гістарычны факт, якім раней пры кожнай антысавецкай кампаніі **казыраў** польскі фашызм, сёньня ў вялікай ступені страціў свае мабілізацыйныя здольнасьці і пачынае дзейнічаць у **адваротным напрамку.** Польская буржуазія прымушана **больш тонка** замазваць **клясавы** характар бітвы пад Віслай, характар якой усё больш і больш усьведамляюць польскія рабочыя і сяляне. Цяпер польскі фашызм старэецца не гаварыць больш пра тое, што пад Варшавай яны бараніілі капіталістычную Эўропу ад бальшавіцкай рэвалюцыі, а падкрэсьлівае той момант, што барацьба ішла **за чыста нацыянальныя** правы Польшчы, за «добрую незалежную Польшчу».

3. Лічачыся з узросшымі сымпатыямі працоўных да СССР, польская імпэрыялістычная буржуазія крывадушна запэўнае іх, што ў 1920 годзе рабіліся **«разрахункі са старой царскай Расіяй»** і што яна ніколі **«нават ня думала змагацца з рускай рэвалюцыяй».**

Адзэй з асноўных прычын падпісаньня Польшчай пакту аб неагрэсіі з СССР былі **таксама** гэтыя сымпатыі працоўных да сацыялістычнага будаўніцтва.

Ці вынікае, аднак, з усяго гэтага вывад, што польскі імпэрыялізм **адмовіўся** ад сваіх інтэрвэнцыянісцкіх плянаў на Ўсходзе? **Ні ў якім разе і ніколі!**

Бясспрэчна, што працэсы і зрухі, якія адбываліся і адбываюцца ў народных масах Польшчы, у значнай меры **тармозяць і паралізуюць** інтэрвэнцыянісцкую палітыку польскага фашызму. **Старыя** мэтады ўзьдзейнічаньня на масы не даюць належнага эфэкту і таму неабходны пераход да новых мэтадаў, **больш тонкіх і хітрых.**

І тут падпісаны пакт аб неагрэсіі павінен быць тэй **заслонай,** якая прыкрывала-б перад працоўнымі масамі Польшчы падрыхтоўку польскага фашызму да антысавецкай інтэрвэнцыі.

Перагаворы аб падпісаньні пакту з СССР і парафіраваньне гэтага пакту зусім не перашкодзілі **афіцыёзнай** «Газэце Польскай» захапляцца, як гэта **«востры бляск шаблі Пілсудзкага крэсіць на гарызонце будучыні Польшчы агні адважных,** але нерэалізаваных ідэй **Батэрага аб спалучэньні Чорнага мора з Балтыцкім, Дняпра з Віслай, Кіева з Варшавай».** *).

І **пасьля падпісаньня** пакту частка польскай **урэдавай** прэсы зажала ў адносінах да яго выразна **адмоўную** пазыцыю. Вядомы **Мацкевіч** — член «беспартыйнага блёку

Барацьба за апал—важнейшая задача партарганізацый

Аб забесьпячэньні гор. Менску апалам

Пастанова гаркому КП(б)Б

1. Канстатаваць невыкананьне дырэктыў ЦК аб завозе дроў у Менск: па 1 жніўня недадана 6.500 вагонаў (пайшчыкам выдана 33 проц. пляну).

Начальнікамі Гомальскага і Жлобінскага чыгуначных раёнаў не забясьпечана падача вагонаў для перавозкі дроў па чыгунцы, дзякуючы чаму ля чыгункі па раёне **Асіпавіцкага леспрамгасу** засталося 530 вагонаў, **Мазырскага і Калінкавіцкага**—800 вагонаў.

2. З боку гарпрафсавету ня было забясьпечана штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва і нагляд за ходам завозу дроў і забесьпячэньне апалам рабочых і працоўных гораду.

3. ЗРК праявілі поўную незадавальненасьць у справе арганізацыі рэгулярнага забесьпячэньня апалам сваіх пайшчыкаў.

4. З боку гартопу праяўлена нераспарадчасьць і няўменьне арганізаваць ужо ў летні час бесьперабойнае забесьпячэньне насельніцтва апалам.

Сакратарыят ГК пастанаўляе:

1. Катэгарычна патрабаваць ад упаўнаважанага Наркамлесу **павялічыць адгрузку** дроў з леспрамгасаў, **прызначаных** для забесьпячэньня гор. Менску апалам. **Прасіць ЦК КП(б)Б узьдзейнічаць на Асіпавіцкі, Бабруйскі, Клічаўскі, Мазырскі, Парыцкі, Пятрыкоўскі, Жытковіцкі, Чэрвеньскі і Заслаўскі раёны, якія ня выконваюць план вывазкі ўжо загатоўленых дроў да чыгуначных і шасэйных шляхоў, узмацніўшы работу па загатоўках.**

2. Прапанаваць фракцыі гарсавету арганізаваць транспарт па адстаўцы па кватэры рабочых дровы з аплатай **ня больш 8-10 руб. за шурку (2,5 кбм.).**

3. Для вывазкі дроў з Чэрвеньскага і Заслаўскага леспрамгасаў абавязаць загадчыка Менаддзяленьня Саюзтрансу т. Горнага.

Вызначыць ня менш 5 аўтамашын з прычэпамі для работ круглыя суткі, пачынаючы з 25 ліпеня.

4. Абавязаць т. Шапіра ўстанавіць дакладныя планы вывазкі дроў для г. Менску.

5. Абавязаць гартоп забясьпечыць усіх пайшчыкаў да 1-X і культбытавыя ўстановы да 1-XI вызначанай нормай дроў, устанавіўшы бягучынную выдачу дроў з бліжэйшых і найбольш выгаднейшых для вывазкі чыгуначных веткак (таварная станцыя, Ляхаўкі і Камароўкі).

Пакінуць парадак выдачы дроў пайшчыкам на прыняцьцю мінулага году, выходзячы з колькасьці топак па спраўках жакту.

Лічыць немагчымым павышэньне цэн на дровы для рабочых пайшчыкаў, аб чым паставіць пытаньне перад ЦК КП(б)Б.

6. Устанавіць, што ЗРК павінны несьці адказнасьць за своячасовае забесьпячэньне сваіх пайшчыкаў дрывамі.

7. Для ўзмацненьня апэрацыйнага кіраўніцтва ходам вывазкі дроў у Менск вызначыць у Лесбеле і ў кожным леспрамгасе адказных асоб за адгрузку апалу ў Менск.

Прапанаваць фракцыі ГСПС вылучыць упаўнаважаных ва ўсе леспрамгасы, якія адгружаюць апал для Менску, узгадніўшы сьпіс упаўнаважаных да 19-VIII з сакратарыятам ГК.

8. Прапанаваць фракцыі гарсавету ўстанавіць вартаўнікоў для аховы выгрузкі дроў па ўсіх чыгуначных ветках.

9. Даручыць рэдакцыі «Зьвязда» арганізаваць кантроль і мабілізацыю грамадзкасьці на своячасовае выкананьне заданьняў па адгрузцы дроў у Менск.

10. Прасіць ЦК КП(б)Б на адным з бліжэйшых сваіх пасяджэньняў паставіць пытаньне аб ходзе завозу дроў для г. Менску.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б ШПЭКТАРАЎ.

ДАСТАЎКА ДРОЎ МЕНСКУ

15 жніўня	16 жніўня	17 жніўня	18 жніўня	19 жніўня
6	1	2	4	19

УВАГА: Згодна пляну ў Менск павінна прыбываць штодзённа 77 вагонаў.

Чыгунка зрывае дастаўку дроў

Выкананьне пляну адгрузкі дроў леспрамгасамі пралетарскім цэнтрам пастаўлена пад пагрозу з прычыны таго, што чыгунка ня выконвае заявак на падачу вагонаў.

У Асіпавіцкім леспрамгасе, на які прыпадае каля 40 проц. патрэбных дроў Менску, на складах ля чыгункі ляжыць каля 450 вагонаў дроў. Леспрамгас за тры дні (17—19 жніўня) патрабаваў 141 вагон, але чыгункай падані толькі адзін вагон. Для адгрузкі ў верасьні патрэбна 900 вагонаў, заяўка на якія ўжо дана. Чыгунка павінна зараз-жа распачаць дастаўку вагонаў для ўдарнага выкананьня пляну адгрузкі.

Такое-ж становішча і ў Парыцкім леспрамгасе. Ня гледзячы на своячасовыя заяўкі, леспрамгас ні аднаго вагону не атрымаў.

Указанае становішча сьведчыць аб тым, што кіраўніцтва чыгункі безадказна адносіцца да выкананьня важнейшай дырэктывы партыі і ўраду аб фарсаваньні адгрузкі дроў Менску.

З боку кіруючых партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый трэба наладзіць жорсткі кантроль за выкананьнем заказаў леспрамгасаў чыгункай.

Р—о.

Алюміні з украінскага кааліну

ХАРКАЎ. Украінскі навукова-дасьледчы інстытут прыкладнай мінэралёгіі атрымаў першыя 158 кгр. алюмінія з вокісі алюмінія, атрыманай у інстытуце з украінскага кааліну. Распрацоўка тэхналёгічных працэсаў атрыманьня алюмінія з украінскага кааліну інстытутам скончана. Такім чынам, дняпроўскі алюмінікамбінат можа быць у поўнай меры забясьпечан вокісьлю алюміны з украінскага кааліну.



Панарама будаўніцтва першых дзьвюх домен і газаачысткі Марыупальскага металюргічнага заводу.

Праца па стварэньні гісторыі грамадзянскай вайны ідзе нездавальняюча

Зьлёт чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў гор. Менску, які адбыўся 18 жніўня г. г., паказаў, што пастанова ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб выданьні «Гісторыі грамадзянскай вайны» падхоплена актыўнымі ўдзельнікамі грамадзянскай вайны з вялікай зацікаўленасьцю і з поўнай палітычнай адказнасьцю ў перадачы вопыту клясавай барацьбы ўсім працоўным СССР, а таксама і сусьветнаму пралетарыяту, які змагаецца за камунізм.

Многія з удзельнікаў грамадзянскай вайны ўжо далі ўспаміны аб сваім удзеле ў барацьбе, астатнія гатовы ў любую хвіліну падзяліцца сваім вопытам.

Паўстае пытаньне—дзе-ж труднасьці ў рабоце па стварэньні «Гісторыі грамадзянскай вайны»?

А труднасьці ў тым, што нізавыя партыйныя, камсамольскія, прафэсыянальныя і іншыя грамадзкія арганізацыі не мабілізаваліся на правядзеньне пастаноў цэнтральных органаў партыі, не ўзначалілі актыўнасьці мас, не павялі сыстэматычнай і арганізаванай работы па папулярызацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб выданьні «Гісторыі грамадзянскай вайны», не арганізавалі працоўных на правядзеньне ў жыцьцё гэтых пастаноў і не кіравалі гэтай работай.

З боку цэлага раду грамадзкіх арганізацый паглядаецца яўная недаацэнка ўсяго палітычнага значэньня пастановы ЦК аб выданьні «Гісторыі». Гэта выклікае слабасьць паступлення матар'ялаў у рэдакцыю, незадаваленьне ўдзельнікаў грамадзянскай вайны тым, што партыйныя арганізацыі слаба або зусім не растлумачылі палітычнага значэньня пастановы партыі аб стварэньні «Гісторыі грамадзянскай вайны».

З урокаў зьлёту менскіх партызан і чырвонагвардзейцаў ГК і РК КП(б)Б, камсамольскія, прафэсыянальныя і іншыя грамадзкія арганізацыі павінны зрабіць для сябе практычны вывад. Трэба з усёй бальшавіцкай энэргіяй узяцца за правядзеньне пастаноў партыі аб выданьні «Гісторыі грамадзянскай вайны».

Работа па стварэньні «Гісторыі грамадзянскай вайны» вялізарна. Яна можа быць выканана пры ўмове, калі кожны працоўны, кожны ўдзельнік грамадзянскай вайны прыме ў гэтай справе самы актыўны ўдзел. Трэба памятаць, што «Гісторыя грамадзянскай вайны» патрэбна і для тых, што будуюць бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва, і для пралетарыяту капіталістычных краін, які ідзе да свайго Кастрычніка.

Дабіцемся ва што-б та ні стала ліквідацыі адставаньня ў рабоце.

За бальшавіцкія тэмпы ў выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б!

Сакратарыят «Гісторыі грамадзянскай вайны ў Беларусі» ІВАНОЎ.

ТРАМВАЙ ПАЙШОЎ НА ЛЯХАЎКУ

ЗЬЛЕВА: трамвай падыходзіць па вул. Энгельса да Савецкай; справа—каля заводу «Бальшавік».

Зьм. ПАВАРОТНЫ

Пярэбары акраіны

НОВЫ МЕНСК, чырвоная сталіца Савецкай Беларусі, пачаў будавацца і расьці фактычна ў першыя гады першай пяцігодкі. Да 1928 году мы залечвалі раны, панраўляліся ад белапольскіх акупацый, фронтоў грамадзянскай вайны і бандытаў. Устаўлялі вокны і дзьверы, насьцілалі строхі ў спаленых і разбураных дамох. Менск, яго пралетары, яго працоўныя масы былі ў авангардзе рэвалюцыі, гераічна абаранялі маладую савецкую краіну з захаду. У гэтай абароне панесены цяжкія страты. Для новых пераходаў трэба было апраўіцца, адбудавацца.

У 1929, тры гады таму назад, **у XII-ую гадавіну Кастрычніка, пайшоў у Менску трамвай.** Гэта быў адзін з найпрыгажэйшых дзён. Была адна з самых вялікіх урачыстасьцей, якія калі-небудзь ведаў горад.

Цяпер мы маем у Менску 60 клм. кругавога туру гарадзкой чыгункі. У мінулым годзе трамваем перавезена 17.620.200 чал. За першае паўгодзьдзе 1932 г.—11.206.300 чал., супроць пляну ў 10.630 тыс. чал. За ўвесь кароткі час існаваньня на Менскім трамваі праехала 40 млн. чал. На кожную душу ўсяго гарадзкога насельніцтва ў сярэднім падае 200 паездак. Гэтыя скромныя лічбы—сьмяротны ўдар па апартуністах і малаверах, якія зрывалі будаўніцтва Менскага трамваю.

12 жніўня г. г. уключана **новая, пятая лінія.**

ТРАМВАЙ ПАЙШОЎ НА ЛЯХАЎКУ! Гарадзкая жалезная дарога перасекла Ляхаўку, раней забітую, бедную, цёмную, і забруджаную акраіну. Гэта яркі факт нашай новай перамогі, факт вялікай гаспадартай і палітычнай сілы.

Недалёка ад Ляхаўкі, зараз-жа за пераездам, да рэвалюцыі стаялі тры вялікія карчмы. Гэта прыгарадная вакзаліца так і звалася—«Тры Карчмы». На самой Ляхаўцы зьмяшчаўся цэнтральны гарэлачны склеп, галоўная мацанолька. І Тры Карчмы і склеп з вялікімі цэмэнтнымі засекамі былі сынонімам для п'янай Ляхаўкі.

Сёньня гэтага нічога няма. Тры Карчмы адсунуты ў прапхасьць. На іх месцы вырас **рабочы пасёлак «Камінтэрн». Ляхаўка стала горадам, горадам Менску.** На ёй вырасьлі два новыя чырвонасьцяжныя заводы **«Бальшавік» і імя Варашылава.** На ёй пабудавана многа новых будынкаў. Пушчаны трамвай яшчэ больш набліжаў пралетарскую Ляхаўку да цэнтру сталіцы, **ператварыў раней**шую **вакраіну ў найлепшую вуліцу гораду. Акраіна перабраецца на новае, шырокае і прасторнае месца кіпучага гарадзкога жыцьця.**

Гісторыя Ляхаўкі—паказальная гісторыя будаўніцтва і росту ўсяго Менску. Камароўка, якая здаўна грымела адважнай панажоўчынай, ператворана ў **цэнтр здаровага вясельля і культурнага адпачынку.** Стадыён. Першая ўсебеларуская выстаўка. Парк культуры. Вучэбны камбінат. Паліклініка. Дом друку.—Вось што за 3—4 гады створана рабочымі рукамі на камароўскіх пустырох.

Мы кожны дзень расьцем і гэты рост стаў для нас простай, звычайнай справай. У канцы па Савецкай, каля чыгуначнага мосту, яшчэ зусім нядаўна былі старыя сады і разьбітыя мястачковыя хібаркі. Сёньня тут—5 карпусоў **Універсытэцкага гарадка.** Вырасьлі сьцены самага вялікага і ў хуткім будучым самага прыгожага будынку ў Менску—**Дому Ўраду.**

Яшчэ зусім нядаўна, па Маскоўскай вуліцы ня было ніводнага каменнага дому. Цяпер там пабудаваны аграмадзіны—**дамы ў 76 і 112 кватэр, якія заселены гераічна рабочымі сем'ямі.**

Падгорную вуліцу з пазыкрасьцю абміналі пешаходы, абыходзілі фурманкі. Па ёй, разьбітай і гарыстай, толькі ледавата трукацелі ламавікі. **Цяпер вуліца К. Маркса ператвараецца ў самую прыгожую, забрукаваную клінкерам, вуліцу.**

Мы толькі ўзялі паасобныя, больш яркія факты росту Менску за апошнія гады. Мы ня можам даць **УСІХ** вестак пра шпаркі рост дабрабыту сталіцы. А цікава і карысна было-б падлічыць, колькі за час рэвалюцыі **разбурана гнілых хібарак** і колькі **ПАБУДАВАНА НА ІХ МЕСЦЫ НОВЫХ СЬВЕТЛЫХ КАМЯНИЦ,** колькі **рабочых сем'яў** перасяжена з мокрых сутэрэньняў у новыя кватэры. Гэтага, на жаль, ня ведае і Менскі гарсавет, хоць у яго ёсьць спэцыяльныя аддзелы **камунальнай гаспадаркі** і ўліку плянаваньня.

Мы расьцем шпаркімі тэмпамі. Нашы патрэбнасьці растуць яшчэ хутчэй і абганяюць наша агульнае развіцьцё. Горад адчувае вялікую пазыку ў кватэрах, хоць за адзін толькі 1930 г. пабудавана 25 тыс. кв. м. жылой плошчы. За апошнія два гады электрастанцыя пашырылася амаль у 3 разы і ўсё-ж горад адчувае востры недахват электраэнэргіі. Гораду не хапае вады, новых трамвайных ліній, пральняў, лазьняў, кінобаў і сталовых. І ўсё гэта мы будуем.

Перад Менскам, як і перад усёй краінай, сьветлая будучыня. Яшчэ адна пяцігодка, яшчэ адзін гістарычны пераход і сталіца БССР стане перадавым, узорным сацыялістычным горадам Савецкага саюзу.

Л. ЧАРНЯКОЎ

ДЗЕСЯЦЬ МЕСЯЦАЎ НАПРУЖАНАЙ БАРАЦЬБЫ

(ДА ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ «ПРАВДЫ»)

10 месяцаў назад «Правда» абвясьціла конкурс нізавых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Гэты конкурс адкрыў перад вялікай армяй рабселькораў і нізавымі газэтамі ў калгасах, саўгасах і МТС новы прастор для праяўленьня іх ініцыятывы і творчай энэргіі ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

І сапраўды, **дзякуючы непасрэднаму і канкрэтнаму кіраўніцтву ЦК КП(б)Б і ўсіх парторганізацый і сыстэматычнай дапамозе «Правды»,** лёзунг ЦК аб тым, што **«справа арганізацыі і правядзеньня конкурсу, справа ўсёй КП(б)Б, усёй пралетарскай грамадзкасьці** сапраўды ператвараецца ў жыцьцё, у жывую справу.

Асноўным і важнейшым вынікам конкурсу зьяўляецца **значны рост партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам.** Прыклад блізкага падыходу да пытаньняў нізавога друку нінецкага акругу, **канкрэтнае і штодзённае партыйнае кіраўніцтва клімавіцкага райкому** і раду сельпартгрупак Клімаўшчыны, **значнае ўзмацненьне партыйнага кіраўніцтва** из Гомельшчыны — гэта толькі **асобныя ў агульным узмацненьні партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам.**

Але ня толькі ў рабітах ёсьць такое ўзьнясьце партыйнага кіраўніцтва. Уцізе, у партгрупках мы маем таксама значнае павышэньне начуцьця адказнасьці за работу сваіх нізавых газэт. Тое, што партгрупка Брылеўскага саўгасу (Гомель) зьявілася **непасрэдным арганізатарам сумесна са сваёй газэтай** раду **рэйдаў** па падрыхтоўцы **да веснавой** сяўбы, расставіўшы партыйныя сілы ў рэйдавых брыгадах так, каб забясьпечыць найбольшы вынік ў іх рабоце, — зьяўляецца характэрным для многіх партыйных ячэек. **Блізка і канкрэтна** падыйшла да пытаньняў партыйнага кіраўніцтва рабкорамі Гусарскага сельпартгрупкі, Клімавіцкага раёну. Іменна **у гэтай ячэйцы** было **ўпершыню на практыцы** праверана вялізарнае значаньне і роля **сельпартарганізатара па друку.**

За час конкурсу нарадзілася новае ў сыстэме партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам — сельпартарганізатары па друку. Рост партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і роля насьцелгазэт у барацьбе партячэек за асноўныя задачы партыі досыць пра характарызуюцца **зазнай сакратара ячэйкі КП(б)Б Брылеўскага саўгасу** (Гомель) на вызначэньні пасяджэньні пэн фрэльнай конкурснай камісіі ў Гомелі: **«Я не ўяўляю слабо зараз кіраваць ячэйкай і саўгасам без насьценнай газэты».**

Яркім прыкладам росту сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва зьяўляецца і наступны факт: Сакратар парт'ячэйкі Гусарскага сельсавету тав. Іванекін паехаў на вайсковую прападрыхтоўку. І вось ня было тыдню, каб ён ня прыслаў **ліст у ячэйку,** дзе асаблівы ўпор рабіўся **на ўзмацненьне работы друку,** на недапушчэньне асабленьня яго, дзе даваўся рад каштоўных і канкрэтных указаньняў аб рабоце насьценгазэт сельсавету.

Такі рост увагі нізавому друку з боку нізавых партарганізацый невыпадковы. Ён выходзіць з установкі ЦК і XIV зьезду КП(б)Б аб тым, што **«работа па ўзмацненьні сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькорамі зьяўляецца адным з адказьнейшых вучасткаў агульна-партыйнай работы».**

Сакратары ЦК КП(б)Б **т. т. Гінало** (на сходзе партактыву, прысьвечаным 20-годзьдзю «Праўды»), **Шарангоўм** (на сходзе Менскага партактыву у дакладзе аб выніках ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б), **Жабрэўскі** (на пленуме ЦК КП(б)Б) і **Іваноў** (на пленуме ЦП саюзу чытчыкоў-грамадзянаў) **яшчэ падкрэсьлілі тое месца і ролю, якую займае і адыгрывае нізавы друк і рабселькораўскі рух у барацьбе за асноўныя задачы партыі.**

Толькі гэтымі, такой вялізарнай увазе ўсёй КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК і мясцовых парт камітэтаў, мы абавязаны дасягненьням у конкурсе «Праўды».

А дасягненьні гэтыя сапраўды вялікія. Зьявіўшыся магутным вагаром у ажыцьцяўленьні пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху ад 16 красавіка 1931 году, **ранейшыя** ўсесаюзныя нарады пры «Правдзе» і 2-га ўсебеларускам зьезду рабселькораў, **конкурс** уніс сур'ёзныя і глыбокія **зрухі ў перабудову рабселькораўскага руху.**

Радкі сталі насьценгазэты, якія выходзяць адзін раз у месяц, у два тыдні. **Пераважнай формай стала пяцідзённа, трохдзённа, штодзённа.** Нізавыя газэты набылі большую апэратыўнасьць і рухавасьць, навучыліся хутчэй адкідацца на бягучыя кампаніі, на барацьбу за рэалізацыю рашаючых задач, якія ставяць партыя і ўрад.

Паглыбіліся сувязі з масамі. Нізавы друк аброс актывам, тысячамі новых селькораў. Усё больш укараняюцца новыя формы работы (рэйды, брыгады, спэцыялізаваныя нарады і г. д.). Нарадзіліся і ўсё шырэй разгортваецца новае зьявіна **бальшавіцкага друку — брыгадныя насьценныя газэты.**

Конкурс зьявіўся ў руках партарганізацый баявым інструментам, праз які яна дабівалася і дабіваецца ягчэ большага павышэньня **вытворча-арганізатарскай ролі нізавога друку** ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае **ўмацаваньне калгасаў.** Сотні прыкладаў таму сьведчаць.

Ужо летаньня загатоўкі, якія праходзілі ў самым пачатку разгортваньня конкурсу «Правды», набіралі тэмпаў яго, далі баявое **хрыпчэньне** раёнаму і нізавому друку ў бальшавіцкай рэалізацыі залаг конкурсу, паказалі тым вялізарным магчымасьці, тую невычарпальную ініцыятыву, той вялізарны запас палітычнай сьвядомасьці, энэргіі, гібкасьці і апэратыўнасьці, якія захаваны ў рабселькораўскім руху.

Дзесяткі прыкладаў пястомнай барацьбы нізавога друку з шэлёным супраціўленьнем клясавага ворага, барацьбы з буржуазнымі месьцінкімі тэндэнцыямі, з вулепкімі спробамі сарваць загатоўкі зьявіўся надзвычай добрай школай для ўсяго друку БССР у яго далейшай барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Як у часе загатовак, так і ў часе падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы друк БССР пад кіраўніцтвам партыі показаў узор того, як трэба змагацца з апартуністамі ўсіх месьцаў і асабліва з правымі, як галоўнай небясьпекай на даным этапе.

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы, барацьба за своячасовы рамонт інвэнтару, за стварэньне насенных фондаў, за правільнае наладжань не ўліку працадзён, за стварэньне пастаянных калгасных брыгад, за ўкараненьне ў практыку калгаснай вытворчасьці с умоў таў. Сталіна была па-баявому праведзена друкам БССР.

Хто не памятае насеннай пазыкі, якая дала тысячы цэнтнераў насеньня, поўнасьцю правезенай намаганьнямі рабочых і нізавога друку пры патрэбнасьці партарганізацыі і ў першую чаргу ЦК КП(б)Б? Хто не памятае ўсебеларускага рэйду і сотень мясцовых рэйдаў, ачышчаньняў дворам, якія **ператвараліся** «сяўсьвяткавательствам», бесьпрацоўнасьць, абмеркаўсьцім тэмпы работы па падрыхтоўцы да сяўбы, апартуністычныя спробы скарэнць насеньні пляны? Гэтыя рэйды арганізоўвалі пераадоленьцца вопыту і тут-жа дапамагалі ліквідаваць адставаньне ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Узяць хоць-бы насьценгазэту **«Прамень напгасьніка» калгасу «Чырвоны трактар»** (Ельскі раён), або насьценгазэту **«Голас камунара» камуны «Ленінская Беларусь»** (Жытковіцкі раён), якія баявой энэргічнай работай дапамаглі дабіцца датэрміноваго выкананьня пляну веснавой сяўбы.

Паказальна-ж, што ў значнай ступені, дзякуючы баявой работе сваёй насьценгазэты, пад кіраўніцтвам парт'ячэйкі, **нацыянальны яўрэйскі калгас імя X-годзьдзя БССР** (Рэчыца) ня толькі вышаў з глыбокага прарыву мінулага году, але ідзе ў авангардзе, як веснавой сяўбы, так і ўборачнай кампаніі. Або насьценгазэта калгасу «Расьсьвет-пераможца», якая выкрыла і выступіла супроць правапартупісьтычных спроб скарацінць насеўныя пляны і г. д.

Такіх фактаў многа. У адным толькі пастанове цэнтральнай конкурснай камісіі аб выніках конкурсу «Правды» прыведзены 53 нізавыя газэты, **чая работа** ужо была несьчаз найлыбейшым зьместам, штодзённай упартай барацьбой за генэральную лінію партыі, за цэнтральную задачу калгаснага будаўніцтва на даным этапе — **арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.**

Вопыт, накоплены ў часе пасеўнай кампаніі, не прапаў марна. У часе ўборкі нізавы друк разгарнуў таксама вялікую работу. Можна прывесьці прыклад выключна ініцыятыўнай работы насьценнай газэты таго-ж калгасу імя X-гадзьдзя БССР, якая ня толькі здолела арганізаваць газэты ў брыгадзе на сежжацці за 25 кілёмэтраў ад калгасу, але і забясьпечыла выданьне штодзённых абменных бюлетэняў у калгасе і на сежжацці і такім чынам мабілізавала калгаснікаў на хутчэйшую ўборку, дабілася разгортваньня спаборніцтва паміж брыгадамі.

Значную ролю ў посьпехах конкурсу «Правды» адыграла **сацыялістычнае спаборніцтва паміж друкам БССР, УССР і Паўночна-Каўказкага краю.** Рад раёнаў (Клімавічы, Жлобін, Гомель) здолелі гэта спаборніцтва ператварыць у магутны сродак абмену вопытам. Гомель, напрыклад, ужо выкарыстоўвае вопыт барацьбы за агратэхніку, «Палеская праўда» стварыла пры рэдакцыі агратэхнічны савет, выдала **кнігі агратэхнічных сторонак** і г. д. Пры дапамозе РК КП(б)Б спаборніцтва ў Жлобіне ахапіла ад грамадзкіх, калгасных і саўгасных арганізацый.

Характэрным у спаборніцтве нізавога друку зьяўляецца тэм, напрыклад, факт, што на ініцыятыве сваёй насьценнай газэты «Расьсьвет-пераможца», сакратарыя сяўбу, паслаў бунсікую брыгаду ў спаборніцтвы з імкалгас Снойскага раёну (УССР).

Немаляважную ролю ў рабоце і росце калгаснага друку адыграў фабрычна-заводзкія газэты. Шматтыражкі «Сельскамад», «Прафінтэрн», «Чырвоная вапранка», «Чырвоны абутнік», «Сьцяг Акцябра», «Чырвоная верацяно» і інш. вучылі нізавыя калгасныя газэты, перадавалі їм вопыт барацьбы за прамфінплян, дапамагалі їм перабудаваць сваю работу пановаму з тым, каб з ягчэ большымі посьпехамі змагацца за пляны сяўбы і ўборкі, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Так, **«Сельмашац» высунуў новую форму дапамогі падшэфным газэтам — сацэмулічэньне.** У часе сяўбы гэта шматтыражка паслала брыгаду ў падшэфны сельсавет, якая не выяжджала адтуль, пакуль прарыў ня быў ліквідаваны і план выкананы.

Удзел фабрычна-заводзкага друку ў конкурсе праходзіў не адарвана, а пад знакам шырокага прыцягненьня да яго прафарганізацый і рабочых мас. У выніку гэтага значна ажывілася шэфская работа.

Вельмі каштоўны зьяўляецца тое, што ў выніку конкурсу сельскае настаўніцтва ягчэ бліжэй і канкрэтней падыйшло да ўдзелу ў нізавым друку.

У выніку конкурсу значна вырасла і сама работа нізавога друку, вырас і паглыбіўся ідэйна-палітычны ўзровень яго штодзённай работы. Ці не паказальнікам гэтаму зьяўляецца тое, што насьценгазэта імя Калініна (Рагачоўскі раён) вядзе праз бюро міжнароднай сувязі пры «Правдзе» ад імя і з удзелам усіх калгаснікаў інтэрнацыянальную перапіску з рабселькорамі Германіі, Францыі, Аўстрыі і Чэхаславакіі? Хіба-ж ня яркім сьведкам гэтаму зьяўляецца тое, што **у калгасе «Большавік Беларусі»** (Клімавічы) **выходзіць 47 брыгадных насьценгазэт,** з разгорнутымі якіх сельпартгрупка (у першую чаргу праз свайго сельпартарганізатара) і агульнакалгасная газэта правяла сыстэматычную работу? Хіба не паказальнікам гэтаму зьяўляецца чырвоная абозы, якія ўжо рушыцьмо ў сувязі з арганізацыяй усебеларускага чырвонага абозу ў адзнаку 15-гадзьдзя «Праўды»?

Вядомна, так **Нізавы друк і рабселькораўскі рух значна пасунуліся наперад.** Але было-б недаразьвальнай памылкай, стратай партыйнай чуйнасьці на гэтым спыніцца, не сказаўшы аб бальшавіцкай прастасьлю, што ў нас ёсьць і надзвычай многа недахопаў.

Факт-ка, што рад раёнаў (Лепельскі, Пятрыкоўскі, Чэрвеньскі, Капыльскі, Прапойскі і г. д.) конкурс праазнілі. Факт-ка, што арыгінальнай работе насьценгазэт яшчэ ходзяць хочам. Яшчэ ня ўсюды канчаткова вемаецца нарматыны выхад газэты.

У галіне партыйкіраўніцтва таксама ёсьць яшчэ рад істотных недахопаў.

Гэта гаворыць аб тым, што спазьнець на ўдарах яшчэ больш рана, што далейшая работа на ўмацаваньні партыйкіраўніцтва, на ўмацаваньні работы самога нізавога друку на **толькі ня можа і не павінна аслабляцца, а наадварот, павінна з дня ў дзень умацоўвацца і ўзьнімацца на новую ступень.**

Важным недахопам работы на конкурсу зьяўляецца і тое, што **друк саўгасаў і МТС яшчэ не заняў таго вядучага месца, якое яму належыць.** І ў гэтых адносінах перад намі стаіць вялізарная, адказная задача.

Асабліва сур'ёзным недахопам у рабоце на конкурсу зьяўляецца тое, што марксыцка-ленінскае выхаваньне не заняло яшчэ таго вядомага месца, якое яно ў сыстэме рабселькораўскага руху павінна займаць. Бяз гэтага рухавога стымулу — набыцьця марксыцка-ленінскіх ведаў, а значыць і без далейшага павышэньня ідэйна-палітычнага ўзроўню, нізавога друку ня можа быць і гутаркі аб далейшых сур'ёзных посьпехах у рабоце нізавога друку, у барацьбе за штодзённае сыстэматычнае павышэньне бальшавіцкай нізавой яго работы.

Слабым месцам у рабоце на конкурсу зьяўляецца таксама недастаткова разгорнутая работа на ўкараненьні агратэхнікі, штодзённая сыстэматычная барацьба за якую павінна стаяць у бліжайшы час у цэнтры ўвагі раённага і нізавога друку, як адна з важнейшых задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Гэта ягчэ больш нас абавязвае ўзмацніць работу па зьнішчэньні недахопаў, па замацаваньні вышэйкажанага конкурсу, у барацьбе за далейшыя посьпехі нізавога друку ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. А далейшыя посьпехі павінны заключацца ў першую чаргу ў баявым скачэньні ўборкі азімых і яравых, узмацненьні тэмпаў цераблення і своячасовай апрацоўкі ільну, у выкананьні пляну загатовак, у баявой падрыхтоўцы і правядзеньні асеньняй пасеўнай кампаніі.

Замацаваць посьпехі конкурсу «Правды» — гэта значыць разгарнуць работу на ўдарнай ўборцы сацыялістычнага ўраджаю ў ішчэ лепшыя тэрміны і без страт. Разгорнутае работы на разьвіцьцё калгаснага гандлю, па выкананьні пляну абозаў і жывёлазагатовак, **ў ўкараненьні агратэхнікі ў саўгасна-калгасную вытворчасьць — задачы, якія павінны быць пакладзены ў аснову далейшага разгортваньня работы нізавога друку і рабселькораў, як адзіных і актыўных памочнікаў ня мучэстнай партыі ў барацьбе за пабудову сацыялізму.**

Вопыт дзесяцімесячнай работы на конкурсу «Правды» сьведчыць таму, што над кіраўніцтвам сваёй парторгарганізацыі рабочы і нізавы друк і рабселькоры БССР з гэтымі адказнымі і пачэснымі задачамі справяцца.

НАПЯРЭДАДНІ АНТЫВАЕННАГА КАНГРЭСУ

На кангрэсе будуць прысутнічаць 3000 дэлегатаў

БЭРЛІН, 22 (ТАСС). Паводле паведамленьня з Амстэрдаму 26 жніўня, г. зн. якраз напярэдадні міжнароднага антываеннага кангрэсу адбудзецца папярэдняя канфэрэнцыя з удзелам членаў арганізацыйнага камітэту і прадстаўнікоў антываенных камітэтаў асобных краін. 28-29 жніўня адбудзецца рад міжнародных канфэрэнцый, як **канфэрэнцыя бы лых удзельнікаў вайны і ахвяр вайны, канфэрэнцыя дактароў, канфэрэнцыя пісьменьнікаў і мастакоў, канфэрэнцыя юрыстаў, міжнародная канфэрэнцыя жанчын, міжнародная сялянская канфэрэнцыя і г. д.**

На кангрэсе будуць прысутнічаць каля 3.000 дэлегатаў з усіх эўрапэйскіх краін, ПАЗШ, Паўднёвай Амэрыкі і Азіі.

Сацыял-фашысцкія лідэры баяцца адзінага фронту працоўных

Інтэрвю Анры Барбюса

ПАРЫЖ, (ТАСС). У «Юманітэ» апублікавана інтэрвю з **Анры Барбюсам**, у якім ён задае некалькі пытаньняў Фрыдрыху Адлеру ў сувязі з пасыцыяй, занятай ім у адносінах да антываеннага кангрэсу. Амстэрдамскі кангрэс — кажа Анры Барбюс — гэта спроба стварыць шырокі аб'яднаны рух працоўных, рабочых і інтэлігенцыі супроць пагрозы і непасрэднай небясьпекі вайны. Тав. Барбюс патрабуе ў Адлера адказу, чаму ён так баіцца гэтага адзінства, **чаму ён пра бує сарваць гэтае адзінства.**

У заключэньне Анры Барбюс канстатуе: 1) Небясьпека імпэрыялістычнай вайны за апошнія месяцы стала актуальнай, як ніколі, а Адлер аб гэтым **ні слова не гаворыць;** 2) Ня гледзячы на ўсе забароны лідэраў II Інтэрнацыяналу, вялікая колькасьць рабочых-сацыялістаў заявіла аб сваёй гатоўнасьці ўдзельнічаць у міжнародным антываенным кангрэсе; 3) Міжнародны антываенны кангрэс у Амстэрдаме будзе ўзорам шырокага адзінага фронту, створанага рабочымі, сялянамі і інтэлігенцыяй розных палітычных напрамкаў, якія парушылі пакон чыць з двуліцай пацыфісцкай фразэалёгіяй і стаць на шлях актыўнай барацьбы супроць падрыхтоўкі новай імпэрыялістычнай вайны.

КРЫВАВЫЯ ЛІЧБЫ

МАСКВА, (ТАСС). ЦК Моцру СССР падагуліў вынікі белага тэрору за 1931 год і за першы квартал **1932 г. Гэтыя даныя, далёка** ня поўныя і складзеныя паводле буржуазных газэт, указваюць **на вялізарны рост ліку забойстваў, арыштаў, ссылак** і г.д. Так, лік параненых і забітых пры сутычках з паліцыяй за 1931 г. складаў **241.445** супроць **21.250** у 1925 г. Лік арыштаваных у 1931 годзе складае **360.499,** супроць **59.573** у 1925 г. Забітых і замучаных па сьмерці за 1931 г. налічваецца **369.707** супроць **11.833** у 1925 г. Па судовых працэсах у 1931 г. прыгаворана да кары сьмерцю **9.548** чал. (у 1925 г. — 447) і да розных тэрмінаў зьняволеньня — **27.230.**

Даныя за першы квартал 1932 г. паказваюць на **яшчэ больш высокія тэмпы росту ліку ахвяр белага тэрору. За тры месяцы** 1932 г. забіта **8.764** чал., цяжка параненых —6.002, лёгка паранена—**6.277,** арыштавана—**95.160** і выслана — **1.790.**

Колькасьць ахвяр белага тэрору **ў Кітаі** не падаецца падліку з-за адсутнасьці статыстыкі. Ва ўсякім разе гэтыя ахвяры налічваюцца ў Кітаі **дзесяткамі тысяч.**

Амаль такое-ж становішча наглядаецца і ў **Індыі.** Па даных «Н'ю Ёрк Таймс» палітзьняволеныя ва многіх капіталістычных краінах падлягаюць жорсткаму ўціску, а ва многіх турмах і катаванню. У знак пратэстаў то тут, то там выбухаюць галадоўкі. За тры месяцы 1931 г. зарэгістраваны **52 галадоўкі палітзьняволеных з 2.427 удзельнікамі і 9.386 днямі галадоўкі.**

Рост настрояў у Вашынгтоне за прызнаньне СССР

Н'Ю ЁРК, 22 (ТАСС). Вашынгтонскі карэспандэнт газэтнага трэсту Скрыпс Говард піша: «Пытаньне прызнаньня СССР — прынамсі пасьлькі ў СССР камісіі для вывучэньня становішча і дакладу ўраду ПАЗШ — набывае больш канкрэтную форму, чым гэта меркавалася раней. У афіцыяльных колах адкрыта гавораць, што зараз наглядаецца меншая варожасьць да савецкага рэжыму, чым была раней ва ўрадзе».

Апошнія паведамленьні прэсы таксама гавораць аб росьце ў Вашынгтоне настрояў на карысьць паляпшэньня савецка-амэрыканскіх адносін. Некаторыя чыноўнікі міністэрства замежных спраў, якія асабіста зьяўляюцца старонынікамі прызнаньня, прадракаюць паляпшэньне савецка-амэрыканскіх адносін у бліжэйшы час, «магчыма пасьля выбараў». Хаця настрої на карысьць прызнаньня бясспрэчна ўзмацняюцца, няма даных сьцьвярджаць, што Гувэр зьменіць сваю пазыцыю.

Сталёвая прамысловасьць ПАЗШ працуе з нагрузкай у 14 проц.

Н'Ю-ЁРК. Прадстаўнікі ўраду ПАЗШ, у тым ліку віцэ-прэзыдэнт ПАЗШ Кертыс, выступаюць з няўгрунтаванымі аптымістычнымі цьвярджаньнямі аб надыходзячым «росквіце». У той-жа час урадавыя органы публікуюць даныя, якія сьведчаць аб далейшым паглыбленьні крызісу. Міністэрства працы паведамляе, што колькасьць занятых ў прамысловасьці рабочых і служачых у ліпені скарацілася **на 4 проц.,** а сума выплачанай зарплаты на **8 проц.** параўнальна з ранейшым месяцам. Ва ўсіх асноўных галінах прамысловасьці вытворчасьць скарачаецца. У сувязі з закрыцьцём аўтамабільных заводаў Крэйслэра і Форда, выпуск аўтамабіляў рэзка скараціўся. Сталёвая прамысловасьць працуе з нагрузкай **у 14 проц.** Будаўніцтва і грузавыя зносіны таксама значна скараціліся. Курс акцый зноў паніжаецца.

ГУВЭРАУСКАЯ ПРАГРАМА „АДНАУЛЕНЬНЯ"

Н'Ю-ЁРК. Праграмная прамова амэрыканскага прэзыдэнта Гувэра на сходзе рэспубліканскай партыі выклікала шматлікія водгукі прэсы ў ПАЗШ і за мяжой. Гэта прамова прадстаўляе сабою разгорнутую праграму таго, што тут завецца «рыкавэры», г. зн. аднаўленьне. Амэрыканская буржуазія ліхаманкава мітусіцца ў пошуках выхаду з крызісу і ўся дзейнасьць ураду за апошні час праходзіць пад знакам таго, каб стварыць, прынамсі, выгляднасьць «аднаўленьня» і ўпушыць шырокім масам надзею на тое, што блізкі варыянт новага «праспэрыці» (росквіту).

Якія-ж шляхі да аднаўленьня намячае Гувэр у сваёй прамове?

Перш за ўсё пытаньне аб даўгох. У процівагу дэмакратам, якія рашуча адхіляюць усякія гутаркі аб аннуляваньні і перагляндзе ваенных даўгоў, якія даюць штогод Амэрыцы 250 млн. даляраў, Гувэр ставіць пытаньне ня так рэзка. **Ён гатоў перагледзець пытаньне аб даўгох пад кутом гледжаньня іх скарачэньня, але толькі пры ўмове адпаведных значных саступак.** Гэтыя кампэнсацыі, па думцы Гувэра, павінны зводзіцца **да пашырэньня рынкаў для амэрыканскіх тавараў** як прамысловых, так і сельска-гаспадарчых. Такім чынам, у разгар жорсткай мытнай вайны «ўсіх супроць усіх» Гувэр патрабуе адмены мытных перагародак для амэрыканскіх тавараў. Гутарка ідзе ня толькі аб па-заэўрапэйскіх рынках, але і аб рынках самой Эўропы, якая паглынае амаль палову ўсяго амэрыканскага экспарту. Адначасова Гувэр у тэй-жа прамове выказваецца за далейшае абмежаваньне іміграцыі ў Амэрыку і **за абарончыя тарыфы.** Гэтым самым лепш за ўсё паказан сапраўдны сэнс тых кампэнсацый, аб якіх гаварыў Гувэр.

Але патрабаваньне кампэнсацыі ў галіне пашырэньня рынку для амэрыканскіх тавараў мае і больш блізкую мэту. Ангельскія газэты аднадушна адзначаюць, што гэта частка прамовы зьяўляецца **адказам на Оттаўскую канфэрэнцыю.** Амэрыка заўзята сочыць за тым, каб у Оттаве ня былі прыняты якія-небудзь радыкальныя пастановы ў галіне ўнутры-імпэрскай пераваг, што затрудніла-б амэрыканскі экспарт у Англію і дамініёны. **Прамова Гувэра—гэта выклік Англіі, які гаворыць аб абвастрэньні англа-амэрыканскіх супярэчнасьцяй.**

Гувэр сказаў таксама, што зьмяншэньне труднасьцяй па ваенных даўгох **эўрапэйскія народы могуць атрымаць праз рашучае скарачэньне ўзбраеньняў.** Інакш кажучы, Амэрыка зноў зьвязвае пытаньне аб даўгох з пытаньнем аб узбраеньнях. Зразумела, амэрыканскі імпэрыялізм менш за ўсё думае аб сапраўдным міры і раззбраеньні. У тэйжа прамове Гувэр падкрэсьліваў неабходнасьць **узмацненьня амэрыканскай арміі і флёту** «ў адпаведнасьці з ваеннымі сіламі іншых краін». Амэрыканскае патрабаваньне скарачэньня ўзбраеньняў зьяўляецца патрабаваньнем ваеннага аслабленьня супернікаў і магчымых праціўнікаў ПАЗШ. Гэта патрабаваньне таксама, як і патрабаваньне кампэнсацыі, паводле заявы «Манчэстэр Гардыян», «зьяўляецца **папярэджаньнем па адрасе Англіі і Францыі, якія заключылі «дагавор аб давер'і».** Ня гледзячы на ўсю слабасьць і адносную такога эдзінага фронту, які эўрапэйскі даўжнікі трабуюць стварыць супроць амэрыканскага крэдытора, Амэрыка падзвычай настарожана адносіцца да яго і аказвае рашучае супраціўленьне кожнай спробе ўмацаваць гэты фронт. Прамова Гувэра гаворыць аб гэтым досыць ясна.

Што датычыць **японска-амэрыканскага антаганізму,** дык ён таксама мае сваё адлюстраваньне ў прамове Гувэра. Гувэр зноў паўтарыў, што Амэрыка не прызнае ніякіх захватаў тэрыторыі, зробленых з парушэньнем мірных дагавораў. Ён гэта сказаў менш рэзка, чым гэта зрабіў Стымсон, але сэнс тут ясны: **суровая перасьцярога па адрасе Японіі,** якая рыхтуецца афіцыяльна прызнаць манчжурскі ўрад і ўзаконіць гэтым самым захват Манчжурыі і якая рыхтуецца да шырокіх апэрацый у правінцыі Жэхэ і да пашырэньня новых удараў па амэрыканскім уплыве ў Паўночным Кітаі.

Характэрнымі зьяўляюцца ў сувязі з гэтым заявы Стымсона адносна неабходнасьці дапоўніць пакт Келёга, у прыватнасьці, шляхам кансультацыі паміж краінамі, што падпісалі пакт. Інакш кажучы, Амэрыка ўсяляк стараецца заручыцца **садзейнасьцю тых ці іншых эўрапэйскіх дзяржаў перад японскай агрэсіяй.**

Праграмная прамова Гувера, прасякнутая духам ліхаманкавых пошукаў «рыкавэры» (аднаўленьне), як мы бачым, не намячае і ня можа намячаць ніякіх шляхоў да сапраўднага выхаду з крызісу. **Яна сыгналізуе толькі аб абвастрэньні імпэрыялістычных супярэчнасьцяй па ўсіх лініях.**

Адначасова апошнія паведамленьні гавораць аб рэзкім паданьні курсаў на амэрыканскіх біржах і аб тым, што той «бум», які быў сфабрыкован у перадвыбарчых мэтах, шпарка выдахся. («Кр. Зв.»).

ЯПОНСКІЯ ВОЙСКІ ЗАНЯЛІ НАНЛІН

Ультыматум кітайскаму гарнізону ў Чаояне

ШАНКАЙ, 22 (ТАСС). Згодна паведамленьню з Бэйпіну, пасьля бою з войскамі правінцыі Жэхэ **японскімі вайскамі акупован пункт Нанлін за 30 міль ад Чаояна (Жэхэ).** Перад захватам 7 японскіх аэраплянаў скінулі ў Нанліне запальваючыя бомбы, зруйнаваўшы чыгуначную станцыю. Штаб японскіх войск у Цэін-Чжоу прапанаваў кітайскаму гарнізону Часяна эвакуавацца на працягу 3 дзён і ачысьціць чыгунку для прасоўваньня японскіх войск. Як паведамляюць, пасьля акупацыі японцамі Нанліну кітайскія войскі адступілі.

Кітайскае камандаваньне зьвярнулася з просьбай да нанкінскага ўраду прыслаць аму ніцыю і падтрыманьне з прычыны пераказі японскіх сіл. Згодна кітайскіх паведамленьняў ваенная канфэрэнцыя ў Бэйпіне, пасьля атрыманьня дакладу Тан Юй-ліне (старшыня правінцыяльнага ўраду Жэхэ), пастанавіла тэлеграфаваць Чан Кай-шы з просьбай прыбыць у Бэйпін для кіраўніцтва апэрацыямі.

Адкрылася сэсія японскага парляманту

ТОКІЁ, 22 (ТАСС). Сёньня адкрылася сэсія японскага парляманту. Адна з галоўных задач сэсіі — зацьвярджэньне дадатковых бюджэтных асыгнаваньняў. Сёньня адбылося 20-цімінутнае пасяджэньне абедзьвюх палат. Заўтра будзе заслухана тронная прамова. Прамовы міністраў будуць, як відаць, заслуханы 24 жніўня. Паводле слоў газэт «Ніці-Ніці» і «Гоміўры» урад Саіто вельмі ўстрывожаны тым, што «экстэрміцкія элемэнты выкарыстоўваюць сэсію для нечаканых выступленьняў».

Палітычнай палёгцы, прафэктуры аддана суровае распаряджэньне занядба пільным назіраньнем за аграрнымі непаладкамі і прыняць меры да недапушчэньня спроб прадстаўнікоў «сялянскага руху» прыбыць у Токіё ў часе сэсіі.

ДРУГІ ПАЛЁТ ПІКАРА Ў СТРАТАСФЭРУ

БЭРЛІН. Апошнія паведамленьні з Цурыху і Мілану падаюць малюнак падрабязнасьцяй палёту праф. Пікара ў стратасфэру.

Разам з Пікарам ляцеў фізык Козінс. Спадарожнік Пікара ранейшага палёту інжынэр Кіпфэр на гэты раз ня прымаў удзелу ў палёце, але пад яго непасрэдным наглядам вялася ўсе падрыхтаваньні.

Аэрастат Пікера падняўся ў Дзюбэндорфэ (недалёка ад Цурыху) 18 жніўня ў 5 гадз. 5 хвіл. і ў 11 гадзін 31 хв. дасягнуў 16.500 мэтраў.

У 17 гадзін 10 хвілін ён спусьціўся паміж Вэронай і Мантуяй. Паводле слоў Пікара, **максымальная вышыня ў часе палёту дасягнула 16.770 мэтраў.** Адпак, дакладныя даныя будуць ім апублікаваны пазьней, пасьля дакладнага прагляду запісаў вымяральных інструмантаў. Тэмпэратура ў гандоле трымалася ў сярэднім на 16 градусах ніжэй нуля, тады як ў часе ранейшага палёту яна даходзіла да 40 градусаў ніжэй нуля. Пікар лічыць, што мэта палёту дасягнута ім поўнасьцю, бо ўсе патрэбныя памеры зроблены. Праўда, пры спуску многія апараты былі разьбіты, але Пікар прадбачыў гэту магчымасьць і загадзя ўжыў меры для выратаваньня гэтых запісаў.

Важнейшымі вымярэньнямі зьяўляюцца вымярэньні пранізваючай сілы касьмічных праменьняў. Гэтыя праменьні звычайна пранізваюць сьвінцовую сьценку таўшчынёю ў 30 сант. Калі запісы апаратаў Пікара пакажуць, што па большых вышынях іх пранізваючая сіла расьце, дык гэта пацьвердзіць, што намі наглядаюцца ня толькі «земныя» касьмічныя праменьні, але і тыя, якія прасякаюць на зямлю з сусьветных прасторaў.

Наступны свой палёт Пікар мяркуе зрабіць з Гудзонава заліва, разьлічваючы, што блізкасьць магнэсавага канцавосься дасьць яму магчымасьць дасьледаваць яшчэ больш падрабязна і дакладна ўласьцівасьць касьмічных праменьняў.

Прыём генэральнага консула Польшчы ў старшыні СНК БССР тав. Галадзеда

23 жніўня, у 12 гадзін дня старшыня СНК БССР **тав. Галадзед** прыняў у сябе генэральнага консула Польшчы ў Менску п. Ялавецкага.

На прыёме прысутнічаў упаўнаважаны НК замежных спраў БССР пры СНК БССР тав. **Якубовіч** (Белта).

АБ УЗМАЦНЕНЬНІ РАБОТЫ БЕЛТА ПРЫ СНК БССР

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

З мэтай карэннага паляпшэньня работы Белта пры СНК БССР, якое мае асаблівае значэньне ва ўмовах БССР, СНК БССР пастанаўляе:

1. Адзначаючы, што да гэтага часу Белта невыстарчальна абслугоўвае Савет Народных Камісараў, Эканамічны Савет і іншыя ўрадавыя органы, прапанаваць кіраўніцтву Белта не позьней як праз дэкаду рэарганізаваць апарат Белта, стварыўшы 3 рэдакцыі: 1) рэспубліканскай інфармацыі з падзелам на галінныя сэктары (сельска-гаспадарчы, прамысловасьці і транспарту, тавараазвароту, спажэньня і фінансавы); 2) ТАСС'аўскай інфармацыі з функцыямі па прыёме міжнароднай і саюзнай інфармацыі і перадачы інфармацыі ў саюзныя цэнтры; 3) раённага і мясцовага друку; 4) бюро інфармацыі пры СНК БССР і аддзелы: 1) арганізацыйна-інструктарскі з функцыямі інструктажу карэспандэнцкай сеткі, вывучэньня якасьці прадукцыі сеткі і апарату агэнтураў і работы па кадрах і 2) адміністрацыйна-тэхнічны.

2. Выдзеліць у сыстэме агэнцтва на асновe гаспадарчага разрахунку прэсбюро для спажэньня артыкуламі і іншымі матэрыяламі раённага, фабрычна-заводскага і калгаснага друку.

3) Забясьпечыць за Белта выкананьне яго асноўных функцый па перадачы афіцыяльнай і ўрадавай інфармацыі для ўсяго друку БССР. У сувязі з чым устанавіць, што ўсе пастановы ўраду і ўрадавых органаў, якія падлягаюць апублікаваньню ў друку, а таксама ўсе ўрадавыя афіцыяльныя інфармацыі, тлумачэньні на віцы з 20 жніўня перадавацца для асьнятленьня ў цэнтральным і раённым друку БССР, выключна праз Беларускае Тэлеграфнае Агэнцтва пры СНК БССР (Белта).

Абавязаць Белта забясьпечыць перадачу ў друк пастаноў урадавых органаў і афіцыяльных інфармацый не позьней як праз 2 гадзіны пасьля атрыманьня пастаноў ці афіцыяльных урадавых інфармацый.

4. З мэтай забясьпячэньня нармальнай перадачы ўсёй інфармацыі ў рэспубліканскі і раённы друк, лічыць неабходным устанавіць у Белта «Клейшмыт» і абсталяваць радыёстанцыю. Прапанаваць Белта скончыць абсталяваньне радыёстанцыі ў месячны тэрмін, абавязаўшы упаўнаважанага НК Сувязі тав. Дубіна і кіраўніка Беларыцэнтру тав. Наўменка выдзеліць для гэтага неабходнае абсталяваньне і матэрыялы. Тэрміны выкананьня 2. дэкады.

5. Прапанаваць Белта забясьпечыць перадачу ўсёй замежнай і саюзнай інфармацыі на беларускай мове.

6. Прапанаваць Белта карэнным чынам палепшыць якасьць інфармацыі для ТАСС'у, забясьпечыўшы бесьперабойную перадачу яе ў саюзны друк.

7. Надаючы асаблівае значэньне стварэньню моцнай карэспандэнцкай сеткі па тэрыторыяльнай адзнацы, прапанаваць Белта ў месячны тэрмін перагледзець карэспандэнцкую сетку, вылучыўшы ў першую чаргу 9 раённых карэспандэнтаў у важнейшых гаспадарча-палітычных цэнтрах БССР (Гомель, Віцебск, Магілеў, Ворша, Бабруйск, Полацак, Мазыр, Барысаў, Слуцак) поўнасьцю вызваліўшы карэспандэнтаў тэтых раёнаў ад работы па сумяшчэньні.

Карэспандэнцкія пункты ў паказальных раёнах арганізуюцца пры гарадзкіх саветах ці раённых выканаўчых камітэтах.

Абавязаць гарадзкія саветы і раённыя выканаўчыя камітэты неадкладна аказаць максымальную садзейнасьць Белта ў арганізацыі гэтых пунктаў (забясьпячэньне памяшканьнем вылучэньне работнікаў і інш.).

8. Абавязаць Белта паладзіць сыстэматычны інструктаж і апэрацыйнае кіраваньне ўсёй карэспандэнцкай сеткай, перагледзеўшы формы аплаты карэспандэнтаў, забясьпечыўшы стымулюючае работы карэспандэнтаў і г. д.

9. Даручыць кіраўніцтву Белта ўзмацніць свой цэнтральны апарат кваліфікаванымі работнікамі.

10. Прапанаваць кіраўніку Белта тав. Табачніку праз месяц паведаміць СНК аб выкананьні гэтай пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

19 жніўня 1932 г.
г. Менск.

ХРОНІКА

* Камісіяй па мастацкім афармленьні Дому ўраду дан заказ мастакам СССР на распрацоўку **праекту помніку Ул. І. Леніна,** які будзе пастаўлен ля Дому ўраду. У хуткім часе адбудзецца грамадзкі прагляд прысланых праектаў. З беларускіх мастакоў-скульптараў прымаюць удзел у распрацоўцы праекту **Браззр і Грубэ.**

* Галоўмастацтва НКАсьветы БССР арганізуе да 15-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі **5-ую ўсебеларускую мастацкую выстаўку.** Заключаны ўмовы на напісаньне мастацкіх карцін, прысьвечаных 15-годзьдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі з наступнымі мастакамі: **Ахрэмчыкам, Забораўым, Гаўрыленка, Грубэ, Кастэлянскім, Браззрам, Пашкевічам** і інш.

* Закончан і здан першы **гукавы фільм на беларускай мове пад назвай «Перамонцы».** Сцэнары напісан Гарбацэвічам, Гезінам і Мініцам. Рэжысэр Аршанскі.

* БДТ-1 да 15-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі будзе ставіць п'есу **Кузьмы Чорнага «Бацькаўшчына».**

* З 1 кастрычніка ў Менску адкрываецца **яўрэйскі і польскі пэдагагічныя інстытуты.**

* З верасьня гэтага году пачынае выходзіць новая **штомесячная ваенна-абарончая літаратурна-мастацкая часопісь «Напагатове»** — орган арганізацыйнага камітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР, пад рэдакцыяй **Л. Арэнштама** (адказны рэдактар), **А. Александровіча, Л. Бэндз, К. Крапівы і Шапавалава.**

Часопісь будзе друкаваць матэрыялы на беларускай, украінскай і расійскай мовах.

* НКАсьветы БССР вядзецца падрыхтоўчая работа для **адчыненьня ў Менску музычнай кансэрваторыі.**

Папраўка

У артыкуле **А. Іофэ** «Аб ахове сацыялістычнай маемасьці» зьмешчаным у «Зьвязьдзе» 19 жніўня ўкралася грубая памылка. У 8-й калёнцы артыкулу, у 5-м абзацы надрукавана: «...на ўліку і кантролі за працоўнымі...» Трэба: **«...на ўліку і кантролі за БАГАТЫМІ».**

Ч. В. А. адказнага рэдактара А. МІТЛІН.

Летні тэатр саду „ПРАФІНТЭРН"
„МЮЗІК-ХОЛ"
Сёньня і штодзённа
6-ты цыкль 6-ты
поўная зьмена праграмы.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
гэтымі днямі
лепшы мастацкі фільм
ВЯСЁЛАЯ КАНАРКА
драма ў 6 частках.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
1. Кафэшант. м. Брыё — Г. Краўчанка.
2. Ад'ютант контр-разьведкі—Ю. Ваойльчыкаў.
3. Нач. контр-разьведкі — М. Даронін.
4. Бранскі — С. Камароў.
5. Лугавец — А. Файт.
6. Жонка Лугаўца — Ада Войцік.
7. Факір-ілюзіяніст — В. Пудоўкін.
Сачыце за рэкламай.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Пач.: 6, 7-30; 9, 10-30 Каса—ад 1 г. дня.
Замежны фільм МУЛЕН-РУЖ Гукавая кіно-часоп. Саюзкіно.
„Інтэрнацыянал" АМОК (ЗАКОН І АБАЯЗВАН) Звыш праграмы хроніка САЮЗКІНО.
„Пралетары" Мастацкі фільм КАМЭРА № 79 драма ў 6 ч. Дзенныя дзіцячыя сэансы СКРОД ЗЬВЯРОЎ Пачатак у 2 гадз. дня.
„СПАРТАК" Пач.: 7, 8-15, 9-30, 11 г. Каса—з 4 г. — 2-я СЭРЫЯ 2-я — МІС-МЭНД.

Беларускі Лесатэхнічны Інстытут
абвяшчае
асеньні ПРЫЁМ студэнтаў
на спэцыяльнасьці, якія ўстаноўлены загадам Наркамлесу СССР і ўзгоднымі з Наркамлесу БССР і СНК БССР.
Інстытут рыхтуе:
1) Інжынэраў па лесанэкспляатацыі, якая спэцыяльнасьць зьяўляецца вядучай і студэнты гэтай спэцыяльнасьці забясьпечваюцца павышаным стыпэндыяй.
2) Інжынэраў-лесаводаў прамысловай лясной гаспадаркі.
3) Інжынэраў-лесатэхналёгаў па лесапіленьні.
4) Інжынэраў-лесатэхналёгаў па вытворчасьці стандартных будаўнічых даталяй.
5) Інжынэраў-лесатэхналёгаў па фанэрнай вытворчасьці.
У інстытут прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 17 да 35 год, якія маюць добрую падрыхтоўку ў аб'ёме праграм рабфаку, 9-гігодкі, ФЗВ на базе 7-годкі, падрыхтоўчых курсаў у ВТНУ. Усе падлягаюць іспытам.
Усе паступаючыя павінны прадставіць дакументы:
1) заверэную анкету, 2) дакумант аб асьвеце, 3) аб сацыяльным становішчы самога і бацькоў і вытворчым стажы, 4) аб здароўі, 5) аб узросьце, 6) копію вайсковага білету, 7) 2 фотакарткі, 8) паштовых марак на 50 кап.
Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, згодна пастановы ЦВК і СНК СССР ад 7-VII—32 г. і інтэрнатамі. Сем'і студэнтаў кватэрамі не забясьпечваюцца.
Прыём заяў да 25 жніўня 1932 г. Іспыты для ўсіх прыяжджаючых з 1 верасьня 1932 г. Заняткі пачынаюцца 1-га кастрычніка 1932 г.
Заявы з дакумантамі накіроўваць па адрасе: г. Гомель, Савецкая, 48—Беларускі лесатэхнічны інстытут.
Таксама праводзіцца набор на вечэрняе аддзяленьне інстытуту, якое адкрываецца пры Бабруйскім дрэвапрацоўчым камбінаце па падрыхтоўцы інжынэраў-лесатэхналёгаў з рабочых без адрыву ад вытворчасьці па спэцыяльнасьцях:
1) Інжынэраў-лесатэхналёгаў па фанэрнай вытворчасьці.
2) Інжынэраў-лесатэхналёгаў па вытворчасьці стандартных будаўнічых даталяй.
Умовы прыёму тыя-ж, што ў дзенны інстытут.
Пры інстытуце ёсьць дзенныя і вечэрнія рабфакі: у Нова-Беліцы пры Дрэвапрацоўчым камбінаце і ў г. Барысаве—пры Барысаўскім Дрэвапрацоўчым камбінаце.
Асьненні набор студэнтаў праводзіцца да 25-га жніўня 1932 г. на ўсе курсы рабфакаў. У Нова-Беліцы рабфак прымае: на дзенны—60 чал., вечэрні—120 чал. і на ўсе курсы рабфакі дзенны—60 чал. і вечэрні—0 чал.
Стыпэндыяй забясьпечваюцца згодна існуючых палажэньняў. Інтэрнат прадастаўляецца.
Заявы з дакумантамі накіроўваць: г. Барысаў, Андрэеўская вул. № 22. Нова-Беліца, вул. Варошкага, 10. Рабфак Лесатэхнічнага Інстытуту.
Дырэктар Інстытуту Калмановіч.

Завочны сэктар Беларускага дзяржаўнага аўтадарожнага вучэбнага камбінату.
Прыём круглы год у завочны інстытут, тэхнікум і на курсы.
Рыхтуе інжынэраў, тэхнікаў, дзеспэтчэраў і дармайстраў па вышукальных работах і эксплеатацыі без рэйкавых шляхоў.
Скончыўшым надаюцца правы адноль кавыя з аддаведнымі стацыянарнымі навучальнымі ўстановамі.
Анкета і праспэкт з правіламі прыёму і навучаньня высылаюцца пры адпраўленьні паштовых марак на 30 кап. Адрас: Масква, Сакольніцкая, 18.
Завочны сэктар Белдзяржаўтадарожнага вучэбнага камбінату.
Завочны сэктар.

Бабруйскі лесапрацыйны вучэбны камбінат БЕЛКООПСАЮЗУ
абвяшчае асеньні НАБОР слухачоў
на аддзяленьні: 1) сельска-гаспадарчае (намесьніці дырэктароў прыгарадных гаспадарак); 2) лесапрацыйнае (інструктары арганізацыі спажыўкааперацыі); 3) гандлёвае (арганізатары савецкага гандлю сярэдняга і ніжняга спажыўсыстэмы).
Прымаюцца асобы з адукацыяй 7-годзі на першыя два аддзяленьні і з адукацыяй 4-5 груп сямігодзі на трэцяе аддзяленьне. Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Да заявы прыкладаюцца дакументы аб сац. становішчы, адукацыі, узросьце, стане здароўя і анкета.
Заявы накіроўваць да 1 верасьня на адрас: гор. Бабруйск, Сакэлістычная, 123, Бабруйскаму лесапрацыйнаму вучэбнаму камбінату.
Дырэкцыя камбінату.

28-8-г.г., у 6 гадзін вечара,
у залі пасяджэньняў ЦСПСБ
адкрываецца
II-гі чарговы пленум ЦСПСБ
З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:
1. Аб перабудове прафработы. (Дакладчык тав. Кавалёў).
2. Аб выніках работы прамысловасьці за 7 м-цаў і далейшыя задачы.
(Дакладчык НК лёг—т. Грысевіч, Наркамцяг—тав. Кибрыжнус).
3. Аб мерапрыемствах па пашырэньні харчовай базы рабочага снабжэньня (сьмяадкорм, трусаводзтва, агародніна, дровы, самазагатоўкі—дакладчыкі: Белкаапсаюз—т. Верба, сэктар рабзабесьпячэньня—т. Герайкор).
4. Аб удзеле прафсаюзаў ва ўборцы ўраджаю і загатоўках.
(Дакл. Наркамзем—Рачыцкі. Судакладчыкі: культмасавы сэктар ЦСПСБ, ЦП саюзаў: МТС і батраноў, жывёлагадоўчых саўгасаў і земляробч. саўгасаў).
5. Арганізацыйныя пытаньні.
Яўка членаў і кандыдатаў пленуму—абавязкова.
Пасяджэньне фракцыі адбудзецца ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ (Дом Прам, 2-гі паверх, пакой № 10) у 2 гадз. дня.
ЦСПСБ.

ВІЦЕБСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ВУЧЭБНЫ КАМБІНАТ
абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў.
1. У інстытут—дзенны і вечэрні. Тэрмін навучаньня—тры гады.
Інстытут рыхтуе вэтдактароў-эпізоатолёгаў-клініцыстаў на базе агульна-ўрачэбнай падрыхтоўкі.
У інстытут прымаюцца асобы ад 17 да 35 год. Скончыўшыя рабфакі, 9-годкі і курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ ў 1931-1932 го дзе прымаюцца бяз іспытаў. Іншыя трымаюць іспыты.
2. На трохмесячныя курсы па падрыхтоўцы ў інстытут прымаюцца асобы з адукацыяй 7-годкі.
Заняткі на курсах пачнуцца з 1 верасьня.
Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
3. У тэхнікум: тэрмін навучаньня—тры гады. Тэхнікум рыхтуе вэттэхнікаў. У тэхнікум прымаюцца асобы з адукацыяй 6—7 груп 7-годкі. Выкладаньне ў тэхнікуме вядзецца прафэсурай і дацэнтурай інстытуту.
4. У рабфак—на дзеннае аддзяленьне 2 і 3 курсу. Для паступленьня на 2 курс патрэбна 5—6 груп 7-годкі.
На 3 курс патрэбна 6—7 груп 7-годкі.
На 3 курс адкрыт набор на яўрэйскае аддзяленьне.
На вечэрні рабфак адкрыт набор на ўсе курсы.
5. На завочнае аддзяленьне інстытуту прымаюцца асобы з сярэдняй асьветай. У тэхнікум—скончыўшыя 7-годку.
Студэнты дзеннага інстытуту і тэхнікуму забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй у залежнасьці ад пасьпяховасьці:
для інстытуту ад 35 да 190 руб.
„ тэхнікуму ад 30 да 125 руб.
„ рабфаку ад 45 і інтэрнат.
Пачатак заняткаў у інстытуце, тэхнікуме, рабфаку—з 1 кастрычніка.
Пры ймовыя іспыты для асоб, што ня маюць адпаведнай асьветы, з 1 па 15 верасьня.
Заявы і дакументы згодна даведніку НКА дасылаць да 20 верасьня па адрасе: Віцебск, вэтінстытуту.
Пры камбінаце з 1 верасьня адкрываюцца сталоўка і закрыты разьмеркавальнік.
Дырэкцыя.

Беларускі хэміка-тахналёгічны інстытут
абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР
студэнтаў на аддзяленьні:
з адрывам ад вытворчасьці:
а) будматар'ялаў (вяжучыя матэрыялы), б) шкляное (тэхналёгічнае аддз.), в) шкляное (эканамічнае) рыхтуе інжынэраў-эканамістаў шкляной прамысловасьці; без адрыву ад вытворчасьці хэмікаў-аналітыкаў, для асоб, скончыўшых тэхнікумы. Рыхтуе хэмікаў па галінах вытворчасьці Наркамлегпраму.
Умовы прыёму, згодна пастановы дзяржаўнага вучонага савету НКА БССР ад 16 ліпеня 1932 г. надрукаванай у газ. „Зьвязда" № 169 ад 30-7-32 г.
Заявы з необходнымі дакумантамі прымаюцца да 25 жніўня ў канцылярыі інстытуту па адрасе: Менск, Зямляробскі заз., Беларускаму хэміка-тэхналёгічнаму інстытуту.
Дырэктар БХТІ Дружелюбскі.

Адкрыт прыём у Полацкі пэдагагічны тэхнікум, дашкольны тэхнікум і адукацыйны пэдкурсы.
Скончыўшыя 7 годзі прымаюцца бяз іспытаў.
Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Заявы і дакументы накіроўваць па адрасе: г. Полац